WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

14 КАСТРЫЧНІКА 2009 г.
СЕРАДА
№ 194
(26552)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

*ДАРАГІЯ ЖАНЧЫНЫ!*

*Прыміце мае самыя сардэчныя віншаванні з Днём маці.*

*У гэты дзень нас перапаўняюць пачуцці вялікай удзячнасці да самых родных людзей на Зямлі — маці. Вашы самаахвярная любоў і адданасць акружаюць чалавека з першых імгненняў з'яўлення на свет, служаць надзейнай апорай у складаных сітуацыях, усяляюць веру ў свае сілы, дапамагаюць дасягаць поспехаў і перамог.*

*Сёння цудоўная нагода выказаць вам словы шчырага захаплення і падзякі за дзіўнае ўменне спалучаць прафесійную дзейнасць з выкананнем свайго галоўнага прызначэння — быць захавальніцамі хатняга ачага, традыцыйных маральных каштоўнасцяў і ўстояў, нараджаць і выхоўваць сыноў і дачок. Папрасіць прабачэння за тое, што не заўсёды ўважлівыя да вас.*

*Дарагія маці, дзяржава высока цэніць вашу нястомную, штодзённую працу. Пытанні аховы мацярынства і дзяцінства, усебаковай падтрымкі маладых і шматдзетных сем'яў з'яўляюцца важнымі кірункамі сацыяльнай палітыкі ў нашай краіне.*

*Няхай вашы дзеці растуць разумнымі, дужымі і таленавітымі, апраўдваюць бацькоўскія надзеі, дораць клопат і саграваюць душэўным цяплом.*

*Моцнага вам здароўя, згоды, дабрабыту і дастатку ў доме, шчасця і любові.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## Прэзідэнт Беларусі прыняў кадравыя рашэнні

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 13 кастрычніка разгледзеў кадравыя пытанні.**

*Кіраўнік дзяржавы назначыў:*

**Хамічонка Мікалая Мікалаевіча** — суддзёй і старшынёй Віцебскага абласнога суда,

**Сычэўскага Уладзіміра Васільевіча** — начальнікам упраўлення ўнутраных спраў Брэсцкага аблвыканкама,

**Палішчука Валерыя Мікалаевіча** — начальнікам упраўлення ўнутраных спраў Гомельскага аблвыканкама,

**Кангро Ірыну Сцяпанаўну** — намеснікам старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта,

**Іпатава Вадзіма Дзмітрыевіча** — дырэктарам Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь,

**Ласуту Генадзя Фёдаравіча** — намеснікам міністра па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь.

*Прэзідэнт даў згоду на назначэнне:*

**Піліпца Віктара Іванавіча** — старшынёй Гомельскага гарвыканкама,

**Дворніка Уладзіміра Андрэевіча** — старшынёй Мазырскага райвыканкама,

**Пальчыса Яна Станіслававіча** — старшынёй Зэльвенскага райвыканкама,

**Стомы Ігара Уладзіміравіча** — кіраўніком адміністрацыі Савецкага раёна г. Мінска,

**Савянка Анатоля Мікалаевіча** — генеральным дырэктарам ВА «Беларускі металургічны завод» — генеральным дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Беларускі металургічны завод»,

**Кірыенкі Валерыя Міхайлавіча** — генеральным дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Вытворчае аб'яднанне «Беларуськалій»,

**Калтовіча Уладзіміра Васільевіча** — першым намеснікам міністра гандлю,

**Марыніча Леаніда Адамавіча** — намеснікам міністра сельскай гаспадаркі і харчавання,

**Дзервянкова Уладзіміра Іванавіча** — намеснікам міністра транспарту і камунікацый,

**Татарыновіча Уладзіслава Вікенцьевіча** — намеснікам міністра фінансаў,

**Гейсіка Віктара Міхайлавіча** — генеральным консулам Рэспублікі Беларусь у г. Даўгаўпілсе (Латвійская Рэспубліка),

**Садохі Валерыя Яўгенавіча** — дырэктарам дэпартамента знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства замежных спраў,

**Паляводы Івана Іванавіча** — начальнікам дзяржаўнай установы адукацыі «Камандна-інжынерны інстытут» Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Кіраўнік дзяржавы таксама даў згоду на прадаўжэнне на два гады тэрміну знаходжання на пасадзе намесніка генеральнага сакратара Еўразійскага эканамічнага супольніцтва **Ворсіна Яўгена Мікалаевіча.**

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Беларусь прадоўжыць перамовы з інвестарамі па продажы БПБ-Банка на максімальна выгадных умовах

**Пытанне мэтазгоднасці продажу замежным інвестарам у цяперашніх умовах аб'ектаў дзяржуласнасці ў Беларусі абмяркоўвалася 13 кастрычніка 2009 года на нарадзе па асобных пытаннях развіцця банкаўскага сектара ў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.**

«Гэта яшчэ адно пытанне асаблівай важнасці, якое павінны абмяркаваць адкрыта, сумленна, прыняць рашэнне», — сказаў Прэзідэнт. Гэта пытанне мае не толькі эканамічнае, але і палітычнае значэнне.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, неабходна адказаць на пытанне, ці трэба ў цяперашні крызісны перыяд, калі падаюць цэны, прадаваць замежным кампаніям буйныя фінансавыя арганізацыі і іншыя аб'екты ў Беларусі, у прыватнасці ААТ «БПБ-Банк» — адзін з сістэмаўтваральных, важнейшых банкаў краіны.

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што ёсць прывабныя прапановы і капітал павялічыць, і крэдыты прадаставіць. «Але крызіс ёсць крызіс — цэны падаюць. І па пытанні, трэба ці не трэба прадаваць якія-небудзь прадпрыемствы, будзе адказ адназначны — трэба. Але стаіць іншае пытанне: за якія грошы?» — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Была праведзена ацэнка БПБ-Банка рознымі інстытутамі. У выніку цана адрозніваецца амаль у тры разы. «Наш інстытут нерухомай маёмасці ацэньвае банк па міжнароднай методыцы ў вельмі вялікую суму, заходнія інстытуты, якіх наймаюць зацікаўленыя інвестары, — у два-тры разы менш. Таму я не магу аднагалосна прыняць сёння рашэнне, калі цэны скачуць», — растлумачыў Прэзідэнт.

Узнікае яшчэ адно пытанне: чаму менавіта сёння наспела неабходнасць продажу аднаго з лепшых банкаў краіны, тым больш што размова ідзе аб продажы не будынка, а добра наладжанага бізнесу. У 2007—2008 гадах на развіццё БПБ-Банка дзяржава накіравала Br260 млрд, у гэтым годзе за кошт бюджэту плануецца павялічыць статутны фонд яшчэ на Br30 млрд. Актывы банка цяпер складаюць $2 млрд, пры гэтым 68 працэнтаў актываў — укладанні ў дзяржсектар.

«Словам, ёсць шэраг пытанняў. Трэба абмеркаваць усе за і супраць з улікам эканамічнай бяспекі нашай краіны. Рашэнне павінна прымацца прынцыповае, і не толькі па БПБ-Банку. Трэба прынцыпова дамовіцца, як будзем сябе паводзіць ва ўмовах фінансавага крызісу, калі цэны на ўсё ўпалі значна», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Па выніках нарады было прынята рашэнне, што Беларусь прадоўжыць перамовы з замежнымі інвестарамі па продажы долі дзяржавы ў ААТ «БПБ-Банк», але на максімальна выгадных для краіны ўмовах.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

## ПАКРОЎСКАЯ ДАРОГА



**Праваслаўнае свята Пакровы — вельмі асаблівы дзень для жыхароў Давыд-Гарадка Столінскага раёна. Менавіта ў гэты дзень гарадчукі наведваюць магілкі і памінаюць сваіх продкаў. На Пакроў таксама прынята хадзіць у госці, а дзеці, дзе б яны ні жылі, вяртаюцца да бацькоў. Тым больш, што 14 кастрычніка ў краіне адзначаецца і Дзень Маці.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сёння ў праваслаўных свята — Пакровы Прасвятой Багародзіцы. Урачыстасць адзначаецца ў гонар цудоўнага з'яўлення Царыцы Нябеснай у Канстанцінопалі — сталіцы праваслаўнай Візантыйскай імперыі. У X стагоддзі гораду пагражала нашэсце сарацын. Народ ноччу маліўся ў Влахернскім храме аб пазбаўленні ад небяспекі. І тут перад вернікамі з'явілася Багародзіца, абкружаная анёламі. Яна зняла з галавы пакрывала і распасцерла яго над людзьмі, абараняючы іх ад ворагаў, бачных і нябачных... Захопнікі тады адступілі ад горада без бою.

Свята, якое прыйшло на Русь з Візантыі ў XII стагоддзі, стала адным з самых шаноўных. У гонар Пакроваў Багародзіцы пісалі абразы, узводзілі храмы. Самы знакаміты — Пакроўскі сабор у Маскве, пабудаваны Іванам Грозным, вядомы яшчэ як храм Васіля Блажэннага.

У Беларусі сёння каля 130 храмаў асвечаны ў гонар свята Пакроваў.

**Таццяна БАЦЮК, «Мінск—Навіны».**

Рынак працы

## МІНСК ЗАПАЛІЎ «ЗЯЛЁНАЕ СВЯТЛО»

*Адмова ў працаўладкаванні з-за адсутнасці рэгістрацыі ў сталіцы — беспадстаўная*

**«Прапішу ў Мінску ці ў Мінскім раёне» — сёння шматлікія аб'явы падобнага зместу можна пабачыць на слупах, станцыях метрапалітэна, аўтавакзалах. Прычым, зразумела, што сама па сабе паслуга прапаноўваецца не за «дзякуй». Жыхарам іншых рэгіёнаў краіны прапаноўваецца зарэгістравацца ў найбуйнейшым горадзе краіны за некалькі сотняў «умоўных адзінак» у год. І перш-наперш — нібыта за магчымасць легальнага працаўладкавання ў сталіцы. Але насамрэч — па сутнасці за нішто.**

### НАЙМАЛЬНІКІ НЕ РЫЗЫКУЮЦЬ

Абавязковы пакет дакументаў, што падаецца пры працаўладкаванні, з'яўляецца вельмі абмежаваным і стандартным для ўсіх жыхароў Беларусі без выключэння. У прыватнасці, Працоўны кодэкс вызначае: у пакет уваходзяць дыпломы ці пасведчанні аб адукацыі, а пры наяўнасці — таксама працоўная кніжка, накіраванне на ўладкаванне за кошт броні для асобных катэгорый работнікаў, заключэнне медыка-рэабілітацыйнай камісіі аб стане здароўя інваліда, ваенны білет. Сюды ж дадаецца і пашпарт. Але не для праверкі «прапіскі». А проста для сведчання асобы.

— Сапраўды, працяглы час працаўладкаванне іншагародніх асобаў у сталіцы мела пэўныя асаблівасці, — распавядае галоўны спецыяліст юрыдычнага аддзела ўпраўлення арганізацыйна-кадравай і прававой работы камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Наталля Ясінская. — У прыватнасці, можна нагадаць: некалі наймальнікам пры прыёме жыхароў блізкіх да сталіцы рэгіёнаў было неабходна праінфармаваць службы занятасці, а пры прыёме жыхароў рэгіёнаў больш аддаленых — патрабавалася ўзгадненне гарвыканкама. І ў апошнім выпадку, за выключэннем уладкавання найбольш запатрабаваных у Мінску спецыялістаў, наймальнікі ўносілі за запрашэнне іншагародніх плату на развіццё сталічнай інфраструктуры. Аднак зараз — парадак ужо іншы. З пачатку мінулага года ўзгадненні не патрабуюцца ўвогуле, мінскія наймальнікі атрымалі магчымасць прымаць работнікаў незалежна ад таго, якую рэгістрацыю яны маюць. Прычым варта падкрэсліць: ніякай адказнасці за ўладкаванне грамадзян нашай краіны з рэгістрацыяй у іншых населеных пунктах або ўвогуле без рэгістрацыі наймальнікі сёння не нясуць.

СТАР. 5

## БЕЛАРУСЫ СТАЛІ МЕНШ АДМАЎЛЯЦЦА АД... ПРАЦЫ

**Паводле звестак Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, за студзень—верасень па дапамогу ў працаўладкаванні ў службы занятасці звярнуліся 261,6 тыс. грамадзян Беларусі, прычым у параўнанні з аналагічным перыядам летась колькасць зваротаў павялічылася на 3,1 працэнта.**

Паказчык зарэгістраванага беспрацоўя зменшыўся — цяпер ён складае 0,9 працэнта ад усяго эканамічна актыўнага насельніцтва краіны. Як заўважыў **начальнік галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва міністэрства Мікалай КОХАНАЎ,** на зніжэнне паказчыкаў зарэгістраванага беспрацоўя паўплывалі адначасова некалькі фактараў — павелічэнне аб'ёмаў прафесійнай падрыхтоўкі моладзі, рост колькасці новых працоўных месцаў, больш актыўная рэгістрацыя грамадзянамі свайго бізнэсу. Плюс да таго, спрацаваў у нечым суб'ектыўны фактар — сёлета беларусы сталі менш адмаўляцца ад вакансій, якія прапануюць службы занятасці. У пачатку кастрычніка ў цэлым па краіне мелі звесткі аб наяўнасці 42,8 тыс. свабодных працоўных месцаў.

**Сяргей ГРЫБ.**

## «ПЕРААБУЙЦЕ» СВОЙ АЎТАМАБІЛЬ!

*Дзяржаўтаінспекцыя рэкамендуе кіроўцам неадкладна змяніць летнюю гуму на зімовую*



— З кожным днём, пачынаючы з суботы, павялічваецца колькасць ДТЗ на дарогах рэспублікі, — паведаміў **начальнік прэс-службы ДАІ МУС Уладзімір СЦЯПАНАЎ.** — Калі ў нядзелю іх было 290, то ў панядзелак ужо 340. Мы звязваем большасць з іх са зменамі надвор'я. Зацяжны дождж, мокры асфальт, запацелыя вокны — ну ніяк не спрыяюць кіраванню аўтамабілем. Вось і сёння па дарозе на працу я трапіў не ў адзін затор. У найбліжэйшыя дні, вось перада мной ляжыць прагноз надвор'я, сіноптыкі не абяцаюць паляпшэнняў, наадварот, ***прагназуюць ападкі ў выглядзе мокрага снегу, у асобных раёнах рэспублікі туман, на дарогах — галалёдзіцу.***

У сувязі з пагаршэннем надвор'я ДАІ настойліва заклікае кіроўцаў «пераабуць» свае аўтамабілі. Лепш не чакаць першага снегу, калі ўсе пабягуць на станцыі шынамантажу, а памяняць гуму цяпер. Раяць змяніць і манеру кіравання: рухацца больш павольна, вытрымліваць дыстанцыю бяспекі.

— Ва ўмовах недастатковай бачнасці ўключайце бліжняе святло фараў, адмоўцеся ад абгонаў, не рабіце рэзкіх неабдуманых манеўраў, — звяртаецца да кіроўцаў Уладзімір Сцяпанаў. — Будзьце найбольш уважлівымі перад пешаходнымі пераходамі. Гэта датычыцца таксама і пешаходаў, якія ў дождж горш арыентуюцца пры пераходзе вуліцы. Ім бы я рэкамендаваў лішні раз паглядзець па баках, каб пераканацца ў адсутнасці небяспекі.

За апошнія дні зафіксаваны не адзін факт наезду на пешаходаў, у тым ліку і са смяротным вынікам.

У якасці прыкладу начальнік прэс-службы расказаў, што ўчора ў Мінску на праспекце Пушкіна ля дома № 28 кіроўца «Хундай» наехаў на дзвюх жанчын, якія пераходзілі вуліцу на дазваляльны сігнал святлафора. Пацярпелых забрала «хуткая». Цяпер высвятляецца, хто вінаваты.

**Надзея ДРЫЛА.**

## СЁННЯ ПАЧАЎСЯ ПЕРАПІС НАСЕЛЬНІЦТВА Ў НАШАЙ КРАІНЕ

**Усе пытанні, што ўзнікаюць па яго правядзенні, можна ўдакладніць па наступных тэлефонах:**

*8 801 100 30 30 (званкі для насельніцтва бясплатныя), а таксама ў гарадах:*

| | |
|---|---|
| г. Брэст | 8 0162 20 53 90, 8 0162 20 31 88 |
| г. Віцебск | 8 0212 37 64 37 |
| г. Гомель | 8 0232 74 57 25 |
| г. Гродна | 8 0152 41 76 74 |
| г. Мінск | 8 017 294 55 45, 8 017 290 93 73 |
| г. Магілёў | 8 0222 22 49 19 |

## У 221 СТАЛІЧНАЙ СЯМ'І ВЫХОЎВАЮЦЦА ПЯЦЁРА І БОЛЬШ НЯПОЎНАГАДОВЫХ ДЗЯЦЕЙ

**На сёння ў органах сацыяльнай абароны сталіцы знаходзяцца на ўліку 5729 шматдзетных сем'яў, з якіх у 4953 — трое няпоўнагадовых дзяцей, у 555 — чацвёра, у 221 сям'і — пяць і больш няпоўнагадовых дзяцей. Пра гэта паведамілі ў Камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама.**

Акрамя выплаты штомесячных сацыяльных дапамог ім выплачваецца разавая дапамога. Так, на 21 верасня 3298 дзяцей са шматдзетных сем'яў атрымалі аднаразовую сацыяльную дапамогу да новага навучальнага года, сярэдні памер якой склаў 75 тысяч рублёў на адно дзіця. Акрамя таго, 213 шматдзетным маці з ліку ўзнагароджаных ордэнам Маці былі выдадзены адзіныя бясплатныя праязныя білеты на праезд у гарадскім транспарце.

**Ніна ЯНОВІЧ, «Мінск—Навіны».**

## ДЗІЦЯ ЗАГІНУЛА НА ПРАГУЛЦЫ

**Маленькі хлопчык загінуў падчас прагулкі на тэрыторыі Гомельскага абласнога дома дзіцяці для дзяцей з пашкоджаннем цэнтральнай нервовай сістэмы і парушэннем псіхікі.**

Як паведаміў **пракурор Чыгуначнага раёна горада Гомеля Раман ГЕРАСІМАЎ,** гадаванец, якому ў канцы снежня павінна было споўніцца тры гады, гуляў разам з групай дзяцей. Калі малыя вярталіся ў памяшканне, хлопчык раптам адышоў у бок, дзе стаяла невялікая шафа — вышынёй прыкладна 1 метр 30 сантыметраў. Менавіта яна ўпала на маленькае дзіця. З траўмамі груднай клеткі і жывата выхаванец быў дастаўлены ў абласную бальніцу, дзе і памёр. Чаму шафка стаяла на тэрыторыі двара лячэбнай установы, пакуль незразумела. Нагадаем, што ў красавіку менавіта ў гэтым доме дзіцяці па віне медыцынскай сястры загінула дзяўчынка, а яе сястра-двайнятка, якой пашчасціла выжыць, перанесла складаную аперацыю на ўнутраных органах.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Антыкрызісная эканоміка

## Прадпрымальнікі просяць не павышаць ПДВ да 20 %

**Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва накіравала ліст з заклікам не павялічваць стаўку падатку на дабаўленую вартасць з 18 % да 20 % у 2010 годзе, а наадварот, «знізіць усе абаротныя падаткі, істотным чынам спрасціць сістэму падаткаабкладання суб'ектаў гаспадарання».**

На думку прадпрымальнікаў, павялічваць стаўкі падаткаабкладання, асабліва ПДВ, нельга ні ў якім разе ў сённяшняй сітуацыі, калі «прадпрымальніцтва практычна не атрымлівае фінансавай падтрымкі, слаба фінансуецца інфраструктура падтрымкі прадпрымальніцтва, не фінансуюцца і не створаны гарантыйныя фонды». Аўтары ліста лічаць, што падатак на дабаўленую вартасць і сёння ў нашай краіне трактуецца залішне шырока, не стымулюе сапраўднае «наданне» хуткасці эканамічных абаротаў, павышэнне эфектыўнасці вытворчасці, а, наадварот, перашкаджае развіццю вытворчай кааперацыі і субкантрактацыі, аб'яднанню прадпрыемстваў пры вытворчасці прадукцыі і паслуг, з-за чаго рэдка абнаўляецца асартымент выпушчанай прадукцыі і прадпрыемствы маюць нізкую ўдзельную вагу інавацый.

«ПДВ сёння — гэта фактычна кантрыбуцыя на дзейнасць. Але ён вельмі зручны з пункту гледжання фіскальных аперацый. Яго лёгка збіраць, спакойна і надзейна, пазбягаючы распрацоўкі сучасных інструментаў і прыёмаў стымулявання і падтрымкі паскоранай вытворчай дзейнасці», — лічаць прадпрымальнікі, адзначаючы пры гэтым, што існуюць умовы якраз для кантролю і праверкі, а не для тых, хто вырабляе.

Дарэчы, прадпрымальнікі скардзяцца ў сваім лісце, што грамадскія аб'яднанні прадпрымальнікаў і бізнэс-асацыяцыі дагэтуль не атрымалі праекта бюджэту краіны на 2010 год і тым самым пазбаўленыя права экспертызы і ўнясення сваіх прапаноў і ідэй, а якраз у праекце бюджэта на 2010 і ідзе гаворка пра павелічэнне стаўкі ПДВ.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

АУКЦИОН

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «ЗЕНИТ – БЕЛОМО»
КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже следующих зданий (цены снижены на 50 %): **Лот № 1:** здание специализированное розничной торговли (пристройка к дому), об. пл. 1576,5 кв.м, **г. Вилейка, ул. Чапаева, 60. Начальная цена с НДС – 379 339 416 бел. руб.** Задаток – 35 000 000 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,1007 га; **Лот № 2:** здания специализированные складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ – здание склада ЛВЖ, об. пл. 684,9 кв.м, здание кислотного склада, об. пл. 196,5 кв.м, **г. Вилейка, ул. Красина. Начальная цена с НДС – 846 143 819 бел. руб.** Задаток – 50 000 000 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,4619 га, имеется ж/д ветка; **Лот № 3:** здание специализированное для производства электротехнического, электронного и оптического оборудования (производственный корпус № 7 с АБК), об. пл. 19605,9 кв.м, **г. Вилейка, ул. Чапаева, 26. Начальная цена с НДС – 5 521 767 668 бел. руб.** Задаток – 100 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06.10.2009 г. Аукцион состоится **21.10.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.10.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

## БРАСЛАЎСКІ ЛЁН



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

***Навучэнцы першага курса Відзаўскага прафесійнага ліцэя сельскай вытворчасці дапамагаюць падымаць і вязаць лён на палетках СВК «Бярозавы край» Браслаўскага раёна. На першым плане будучыя леснікі Карына КРЫВЕЛЬ і Вікторыя САПЕЛЬ.***

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### АЛЬ-КАІДА ЗНАХОДЗІЦЦА НА МЯЖЫ БАНКРУЦТВА

**Міжнародная тэрарыстычная арганізацыя «Аль-Каіда» знаходзіцца на мяжы банкруцтва, тады як радыкальны рух «Талібан» усё больш паляпшае сваё фінансавае становішча.**

Да такой высновы прыйшоў Мінфін ЗША, які апублікаваў даклад аднаго са сваіх топ-менеджараў, Дэвіда Коэна. Паводле яго слоў, у апошні час «Аль-Каіда» знаходзіцца ў цяжкім фінансавым становішчы і імкліва губляе ўплыў. Толькі ў першай палове гэтага года арганізацыя ўжо чатыры разы публічна звярталася з просьбай аб матэрыяльнай дапамозе да сваіх аднадумцаў. Тым часам фінансавае становішча «Талібана» з кожным годам усё больш паляпшаецца. Па меркаванні спецыялістаў міністэрства, асноўны прыбытак групоўка атрымлівае ад мясцовых жыхароў, якія займаюцца законным прадпрымальніцтвам, якім яна дае заступніцтва, а таксама вымагае грошы ў афганскіх фермераў, якія вырошчваюць опіумны мак. Немалыя сумы на карысць радыкальнага руху ахвяруюць яго прыхільнікі з краін Персідскага заліва.

### У МАНЧЭСТЭРЫ ЎСТАЛЯВАЛІ «РАСПРАНАЮЧЫ» СКАНЕР



**У аэрапорце Манчэстэра ўсталяваны сканер, які дазваляе ўбачыць на экране цела пасажыра. Пры дапамозе новага абсталявання пасажыры змогуць праходзіць агляд, не разуваючыся і не здымаючы рамянёў.**

На экране прыбора можна будзе ўбачыць пратэзы, у тым ліку сіліконавыя грудзі, пірсінг, а таксама выразны малюнак усіх частак цела, уключаючы геніталіі. Спецыялісты запэўніваюць, што малюнкі не будуць насіць эратычнага характару і будуць выдаляцца адразу пасля прагляду супрацоўнікам службы бяспекі. Тыя пасажыры, якія не захочуць праходзіць праз гэты сканер, змогуць прайсці стандартную працэдуру агляду. Па словах кіраўніцтва аэрапорта, апраменьванне ад прыбора не з'яўляецца небяспечным для здароўя пасажыраў. Кожны прыбор каштуе прыкладна 80 тысяч фунтаў стэрлінгаў (больш за 125 тысяч долараў). У ЗША такое абсталяванне ўжо выкарыстоўваецца ў шматлікіх міжнародных аэрапортах.

### ХЭЛОЎІН ПАД ПАГРОЗАЙ



**Традыцыйнае святкаванне Хэлоўіна апынулася ў ЗША пад пагрозай з-за недахопу гарбузоў. Прычына таму — моцныя вясновыя дажджы, якія загубілі пасадкі гарбузоў у некаторых частках краіны.**

Свяцільня, зробленая з гарбуза з запаленай у сярэдзіне яе свечкай, цяпер з'яўляецца нязменным атрыбутам Хэлоўіна, старажытнага кельцкага свята, якое на Захадзе шырока адзначаюць 31 кастрычніка. На недахоп гарбузоў скардзяцца фермеры і гандляры ў Вірджыніі, Пенсільваніі і штатах Новай Англіі. Акрамя Хэлоўіна, пад пагрозай апынулася яшчэ адно восеньскае свята — Дзень Удзячнасці, які адзначаецца ў ЗША ў чацвёрты чацвер лістапада. У Дзень Удзячнасці традыцыйнай стравай з'яўляецца гарбузовы пірог, а бедны ўраджай у Ілінойсе — лідары краіны па вытворчасці гарбузоў — абяцае зрабіць гарбузовыя кансервы дэфіцытам.

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.10.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 2 737,00 |
| ▲ 1 еўра | 4 041,45 |
| 1 латвійскі лат | 5 703,87 |
| 1 літоўскі літ | 1 171,08 |
| 1 чэшская крона | 156,50 |
| 1 польскі злоты | 958,17 |
| ▲ 1 расійскі рубель | 92,77 |
| 1 украінская грыўня | 331,76 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 29,5043 |
| UAH | 35,5259 |
| 1000 BYR | 10,7562 |
| EUR | 43,6133 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «Сістэмы вышэйшай адукацыі Беларусі і Расіі маюць патрэбу ў гарманізацыі»

**Старшыня Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам навукова-практычнай канферэнцыі «Стан і праблемы развіцця вышэйшай адукацыі ў рамках Саюзнай дзяржавы».**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што за мінулае дзесяцігоддзе закладзены асновы фарміравання агульнай адукацыйнай прасторы, прадастаўлена беларусам і расіянам аднолькавых умоў і магчымасцяў для навучання ў ВНУ, рэалізавана нямала сумесных асветніцкіх і даследчых праектаў, наладжана актыўнае супрацоўніцтва паміж выкладчыкамі і студэнтамі.

«Упэўнены, што на гэтай канферэнцыі адбудзецца зацікаўлены і карысны абмен меркаваннямі, які дасць магчымасць гарманізаваць сістэмы вышэйшай адукацыі Беларусі і Расіі, зрабіць яшчэ адзін крок для рэалізацыі нашымі грамадзянамі роўнага права на набыццё прафесіі і на дастойную працу», — падкрэсліваецца ў прывітанні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

## Азербайджанскія парламентарыі чакаюць хуткага ўступлення Беларусі ў ПАСЕ

**Аб гэтым заявіў старшыня Мілі Меджліса (парламента) Азербайджанскай Рэспублікі Актай Асадаў на сустрэчы са старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Барысам Батурам.**

«Я лічу, што ўступленне Беларусі ў ПАСЕ — гэта недалёкая перспектыва», — сказаў азербайджанскі спікер. Ён заявіў, што чакае значнай актывізацыі беларуска-азербайджанскіх міжпарламенцкіх адносін пасля заключэння пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным сходам Беларусі і Мілі Меджлісам Азербайджана, якое падпісанае ў Мінску. У сваю чаргу Барыс Батура падзякаваў азербайджанскаму калегу за падтрымку Беларусі ў міжнародных арганізацыях. «Мы ўдзячны за падтрымку на міжнароднай арэне ў такіх арганізацыях, як Міжпарламенцкі саюз, Парламенцкая Асамблея Савета Еўропы, Парламенцкая Асамблея АБСЕ», — сказаў Барыс Батура. Ён выказаў надзею, што гэта падтрымка дасць магчымасць аднавіць статус-кво для Беларусі ў гэтых арганізацыях.

БЕЛТА.

Вяртаючыся да надрукаванага

## Новая падстанцыя вырашыць усе праблемы спажыўцоў?

**У нумары «Звязды» ад 24 верасня пад рубрыкай «гарачы тэлефон» была змешчана скарга Тацціяны Аляксееўны Вашчанкі з пасёлка Міханавічы Мінскага раёна «Сяджу, слухаю, як у халадзільніку падае размарожаны кавалак лёду...» Коратка нагадаем, што на момант звароту ў рэдакцыю насельнікі вуліцы Шашэйнай ужо без малога суткі знаходзіліся без электрычнасці. З усімі, як кажуць, наступнымі вынікамі. Але галоўным было яшчэ і тое, што такія адключэнні, як расказала заяўніца, апошнім часам пачасціліся, у верасні гэта быў ужо не першы выпадак. Праблема ў тым ліку была быццам бы ў нейкай фірме, што таксама была падключана да гэтай жа лініі.**

На скаргу ў газеце мы атрымалі афіцыйнае рэагаванне ад Мінскага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства электраэнергетыкі «Мінскэнерга». У ім падрабязна распавядаецца пра акалічнасці здарэння: сігнал пра пашкоджанне на лініі паступіў увечары, праз некалькі гадзін напружанне было пададзена ўсім спажыўцам, за выключэннем участка, на якім і было выяўлена пашкоджанне. З раніцы наступнага дня працы па пошуку пашкоджання былі адноўленыя. Іх ускладнялі вялікая працягласць участка (15 кіламетраў) і вялікая колькасць кабельных адгалінаванняў, якія небходна было па чарзе адключаць для пошуку пашкоджанага ўчастка. Калі яго знайшлі і аднавілі, выявіліся яшчэ два месцы пашкоджання...

«Прычынай працяглага парушэння электразабеспячэння часткі спажыўцоў пасёлка Міханавічы з'явілася неабходнасць пачарговага аднаўлення адразу трох пашкоджанняў на адным кабелі. Шматлікія пашкоджанні кабельнай лініі, як мяркуецца, маглі быць атрыманы пры правядзенні самавольных раскопак для рамонту газапровода, які праходзіць побач з кабельнай лініяй». У прынцыпе, практычна тое ж нам паведаміў галоўны інжынер Мінскіх электрасетак Андрэй Аксёнаў, да якога мы звярнуліся па тлумачэнні сітуацыі адразу пасля тэлефоннага званка жыхаркі пасёлка Міханавічы. Нас жа, як і насельнікаў вуліцы Шашэйнай, найперш цікавіў іншы момант: чаму адключэнні электрычнасці пачасціліся і як гэта можна было б выправіць?

Наколькі мы зразумелі далей з адказу «Мінскэнерга», сітуацыя будзе выпраўлена. «Для павышэння надзейнасці электразабеспячэння спажыўцоў... Міханавіцкаму сельскаму Савету выдадзены тэхнічныя... на будаўніцтва закрытай трансфарматарнай падстанцыі... у раёне вуліцы Азёрнай. Новая падстанцыя павінна быць падключана да дзвюх ліній 10 кВ (асноўнай і рэзервовай) і на яе будуць пераключаны жылыя дамы...» Спадзяёмся, што пасля выканання гэтых работ жыхарам не давядзецца больш цярпець нязручнасці, а тым больш несці нейкія матэрыяльныя страты, з-за адключэнняў электраэнергіі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

## Абзац

◢ **Супрацоўнікам МНС Астравецкага раёна давялося даставаць з васьмiметровага калодзежа пенсіянерку. На месца здарэння неадкладна выехалі аварыйна-выратавальны аўтамабіль Астравецкага РАНС і брыгада медыкаў. У калодзежы з пітной вадой выратавальнікі выявілі пенсіянерку 1942 г.н. Пры дапамозе вяроўкі ў калодзеж апусціўся начальнік пажарнай змены, які надзеў на пацярпелую неабходныя прыстасаванні. Праз 6 хвілін жанчыну дасталі з калодзежа і перадалі медыкам. З разнастайнымі пашкоджаннямі яна дастаўленая ў бальніцу.**

◢ Вадзіцель і пасажыр вылецелі праз акно мінівэна ў выніку ДТЗ у Смалявіцкім раёне. Міліцыя высвятляе іх асобы. Адзін з іх загінуў, другі паранены і знаходзіцца ў бальніцы без прытомнасці. Машына з'ехала ў кювет і моцна ўдарылася ў дрэва.

◢ **У мінскай гасцініцы «Еўропа» памерла турыстка з ЗША. Пракуратура Цэнтральнага раёна сталіцы праводзіць праверку па факце смерці 50-гадовай грамадзянкі ЗША. Жыхарка штата Нью-Ёрк прыляцела ў Мінск у складзе экскурсійнай групы, што накіроўвалася ў Расію. Увечары 11 кастрычніка яна засялілася ў гатэль, а раніцай наступнага дня яе знайшлі нежывой. Прычыну смерці турысткі павінна вызначыць судова-медыцынская экспертыза. Мяркуецца, што, хутчэй за ўсё, жанчыне стала дрэнна з сэрцам.**

◢ Труп нованароджанага дзіцяці выяўлены ў смеццевым кантэйнеры ў Віцебску. Цела дзяўчынкі, загорнутае ў два поліэтыленавыя пакеты, знойдзена на вуліцы Баўмана. Бачных прыкмет гвалтоўнай смерці на ім не выяўлена. Даўнасць смерці немаўляці — два-тры дні. Прызначана судова-медыцынская экспертыза, праводзіцца праверка.

◢ **У Літве ў хуткім часе з'явіцца «акно жыцця» для выратавання немаўлят. Такое акно з'явіцца ў Вільнюсе ў прытулку для дзяцей з парушэннямі развіцця. Каля ўвахода ў будынак будзе абсталяваная спецыяльная капсула, у якой можна пакінуць нованароджанае дзіця, ад якога хочуць пазбавіцца. Медперсанал, які працуе ў прытулку кругласутачна, адразу ж атрымае сігнал. Каб маці магла застацца ананімнай, у гэтым месцы не будзе відэакамер. Такія «вокны жыцця» сёння ёсць у Швейцарыі, Аўстрыі, Польшчы, Чэхіі, Японіі, Італіі, Бельгіі, Славакіі, Венгрыі і ЗША. Крымінальная хроніка Літвы штогод паведамляе ў сярэднім пра 6 выпадкаў знаходжання забітых немаўлят.**

## Поўны абзац

◢ Мужчынскія вусы прыцягваюць грошы, а барада — наадварот. Амерыканскі інстытут вусоў сцвярджае, што вусы павышаюць шанцы мужчын атрымаць высокааплатную працу. Згодна з праведзеным тут даследаваннем, вусатыя амерыканцы зарабляюць у сярэднім на 8,2 % больш за барадатых калегаў і абганяюць тых, хто гладка паголены, на 4,3 %. Пры гэтым вусатыя амерыканцы трацяць на 11 % больш і адкладваюць зберажэнні на 3 % менш чым тыя, хто аддае перавагу галенню.



◢ **Падчас здымак праекта MTV адна з удзельніц пакінула рэаліці-шоу па трагікамічнай прычыне — у яе ўзарваліся сіліконавыя імплантанты. Умовы шоу патрабавалі, каб удзельнікі скакалі ў ваду па чарзе. Калі давялося скакаць Шавон Торэс, яна няўдала прызямлілася — на жывот, замест таго, каб скокнуць салдацікам. Штучныя грудзі не вытрымалі такога жорсткага абыходжання і ўзарваліся. Дзяўчыну тэрмінова даставілі ў бальніцу. Медыкі канстатавалі разрыў сіліконавых імплантантаў, а таксама моцныя выцятасці. Па парадзе ўрачоў яна пакінула шоу, аб чым шкадуюць яе шматлікія прыхільнікі, якія лічаць Торэс адзіным упрыгажэннем праграмы.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## ВІДЭА ПАДКЛЮЧЫЦЬ НЕ ПАСПЕЛІ

У Пінску па вуліцы 60 гадоў кастрычніка будуецца АЗС. Там вырашылі зманціраваць самае сучаснае абсталяванне і ўсталяваць дзве відэакамеры. Камеры ўсталявалі, а падключыць не паспелі: у хуткім часе ўбачылі, што «відэа» няма. Нехта позна вечарам тыя камеры ўкраў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

# АДЗІНАЯ АДУКАЦЫЙНАЯ ПРАСТОРА САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ: МІФ ЦІ РЭАЛЬНАСЦЬ?

**Учора ў Мінску адкрылася навукова-практычная канферэнцыя «Стан і праблемы развіцця вышэйшай адукацыі ў рамках Саюзнай дзяржавы». Удзел у ёй прымаюць 250 чалавек: сярод іх рэктары беларускіх і расійскіх ВНУ, вядомыя вучоныя, кіраўнікі органаў Саюзнай дзяржавы і органаў адукацыі дзвюх краін.**

Як трапна заўважыў у сваім выступленні **першы намеснік міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЖУК,** усе прынятыя ранейрашэнні па праблемах інтэграцыі нацыянальных сістэм адукацыі Беларусі і Расіі фармулявалі толькі агульныя падыходы да пабудовы агульнай адукацыйнай прасторы Саюзнай дзяржавы. Яго калега, **намеснік міністра адукацыі і навукі Расійскай Федэрацыі Уладзімір ФРЫДЛЯНАЎ** быў яшчэ больш катэгарычны ў сваіх ацэнках: «У нас ёсць сёння і Дагавор аб Саюзнай дзяржаве, і мноства міжгаліновых і міжурадавых пагадненняў у галіне адукацыі. Адно, чаго ў нас на сёння няма — гэта дакумента пад назвай «Адзіная адукацыйная прастора Саюзнай дзяржавы».

Ні для каго не сакрэт, што ўсе сістэмы адукацыі Беларусі і Расіі рэгулююцца падобнымі заканадаўчымі базамі, але ў апошнія гады намеціліся істотныя адрозненні, абумоўленыя спецыфікай сацыяльна-эканамічнага становішча дзвюх нашых краін. Прычым даволі часта рэфармаванне нацыянальных сістэм вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца без уліку ўзятых на сябе бакамі абавязацельстваў у рамках Саюзнай дзяржавы, менавіта па гэтай прычыне нарматыўная база Саюзнай дзяржавы папаўняецца дакументамі, якія не маюць практычнай рэалізацыі.

Напрыклад, ёсць сур'ёзныя разыходжанні ў патрабаваннях да зместу адукацыі і ўзроўню падрыхтоўкі выпускнікоў беларускіх і расійскіх ВНУ і на першай, і на другой ступені вышэйшай школы, розныя падыходы да фарміравання кірункаў магістарскай падрыхтоўкі, разыходжанні ў класіфікатарах (пераліках) спецыяльнасцяў і кваліфікацыях, што прысвойваюцца ўладальнікам дыпломаў аб вышэйшай адукацыі.

— У беларускай адукацыі ёсць вельмі моцны бок — надзейныя традыцыі выкладання фундаментальных дысцыплін, ад якіх мы не збіраемся адмаўляцца, — падкрэсліў Аляксандр Жук. — Мы праважэрна ганарымся тым, што выпускнікі нашых матэматычных школ уваходзяць у эліту сусветнага праграмавання. Але ёсць у нас і традыцыйна слабае звяно — тэхналагічная падрыхтоўка будучых спецыялістаў. Таму, уключаючыся ў Балонскі працэс, мы, з аднаго боку, гатовыя падзяліцца сваёй практыкай выкладання фундаментальных навук, а з іншага — маем намер вельмі актыўна пераймаць еўрапейскую практыку выхавання ў студэнтаў тэхналагічных кампетэнцый.

На думку **старшыні Рэспубліканскага савета рэктараў беларускіх ВНУ, рэктара Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Уладзіміра ШЫМАВА,** важны атрыбут інтэграванай адукацыйнай прасторы — адсутнасць адміністрацыйных бар'ераў на шляху рэалізацыі прынцыпу мабільнасці прафесарска-выкладчыцкага складу дзвюх нашых краін. Увядзенне ў жыццё гэтага прынцыпу дазволіла б, па-першае, больш рацыянальна выкарыстоўваць кадравы патэнцыял сістэм адукацыі дзвюх краін і рэалізаваць на практыцы інстытут запрошаных прафесараў, палепшыўшы тым самым якасную падрыхтоўку спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, а, па-другое, распрацаваць агульны ўзровень аплаты працы прафесарска-выкладчыцкага складу.

— Мне хацелася б падмацаваць свае словы рэальнай сітуацыяй, — паведаміў Уладзімір Шымаў. — На жаль, дастаткова даўно падрыхтоўка па спецыяльнасці «эканамічная кібернетыка» ажыццяўляецца ў нас з вялікім ухілам у бок прыкладной матэматыкі, а гэта прывяло да таго, што нашы выпускнікі вельмі нядрэнна валодаюць абстрактным матэматычным апаратам, але не ўмеюць у поўнай меры прымяняць матэматычны інструментарый для вырашэння актуальных эканамічных задач і праблем беларускай эканомікі. Для ліквідацыі гэтага перакосу мы запрасілі ва ўніверсітэт доктара навук з Расійскай Федэрацыі. Прычым нашы інтарэсы цалкам супалі: нам патрабаваўся высокакваліфікаваны спецыяліст, які, у сваю чаргу, таксама меў патрэбу перабрацца ў Беларусь, на радзіму сваёй жонкі. Аднак пры вызначэнні яму памеру заробкаў мы не змаглі ўлічыць яго доктарскую ступень і званне дацэнта, паколькі яны былі выдадзены Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Расійскай Федэрацыі, адпаведна, патрабавалася іх настрыфікацыя. Гэта, зразумела, вымагае часу. Да таго ж для праходжання працэдуры настрыфікацыі патрэбна, каб сушукальнік меў у Беларусі пасведчанне на права жыхарства, а для яго атрымання таксама патрабуецца пэўны час. Такім чынам у залік расійскаму калегу пайшла толькі кандыдацкая ступень, атрыманая ім яшчэ за савецкім часам. У выніку, узначальваючы кафедру, ён атрымлівае заработную плату толькі як кандыдат навук, што не толькі моцна б'е па кішэні, але і дыскрымінуе яго як высокакваліфікаванага спецыяліста.

Нядзіўна, што сёння расійскі спецыяліст разглядае магчымасць вяртання ў Расію. Мне здаецца, што гэтая калізія цалкам магла быць вырашана: патрабуецца прыняцце толькі некалькіх дакументаў на ўзроўні дзвюх дзяржаў, якія б забяспечвалі аўтаматычную настрыфікацыю (без уліку ВАКа) кандыдацкіх і доктарскіх дыпломаў, дацэнцкіх і прафесарскіх атэстатаў, і гарантавалі магчымасць грамадзянам Беларусі і Расіі працаваць у любой ВНУ Саюзнай дзяржавы пры наяўнасці толькі дакумента аб рэгістрацыі, без наяўнасці пасведчання на права жыхарства.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Рэпліка з нагоды

## ХОЧАШ ЯРКІХ ФАРБАЎ СЯРОД ПАЎСЯДЗЁННАЙ ШЭРАНІ?

# ЦЯБЕ ЧАКАЕ БУЙНЫ МЭБЛЕВЫ ФОРУМ

**Учора раніцай журналісты «Звязды» запланавалі «скочыць» з шэрані будных дзён у атмасферу свята — наведаць XVI спецыялізаваную аптовую выставу-кірмаш «Мэбля-2010», якая распачалася ў сталіцы адразу на дзвюх выставачных пляцоўках. Як ведаюць нашы пастаянныя прыхільнікі, мы не першы год запар наведваем такія форумы, знаёмім чытачоў з вытворцамі, новымі таварамі і паслугамі... І, як пацвярджае зваротная сувязь з падпісчыкамі, даволі часта пастаўленую задачу мы выконваем.**

Але толькі не на гэты раз. Ужо на ўваходзе ў выставачны павільён «БелЭкспа» па вуліцы Янкі Купалы, 27 нас з фатографам спынілі ахоўнікі. Ветлівасцю сваіх папярэднікаў, можам запэўніць як пастаянныя дагэтуль наведвальнікі выстаў, яны не валодалі.

— Дзе ваша запрашэнне? Дзе ваша акрэдытацыя?

— Вось нашы журналісцкія пасведчанні. Колькі памятаем, гэтага было дастаткова для таго, каб прайсці на любую выставу... Апошняя, дарэчы, была на мінулым тыдні.

— Гэта было раней. Вы павінны былі атрымаць акрэдытацыю ў арганізатараў. І ўвогуле, выстава пачне працаваць з 11 гадзін. Адыдзіце, не перашкаджайце заносіць мэблю.

— Падкажыце тады, хто зараз на выставе адказвае за сувязі з прэсай?

У адказ гучыць нешта не зусім зразумелае. Тлумачэнні, што мы свядома наведваем практычна любы форум яшчэ да афіцыйнага яго адкрыцця — каб паспець пагутарыць з як мага большай колькасцю прадстаўнікоў кампаній і фірмаў, даехаць да рэдакцыі і напісаць грунтоўны матэрыял, а не банальную нататку — на гэтых людзей ніяк не ўплываюць. Нам усё ж удаецца падысці да стойкі, дзе быццам бы працуюць патрэбныя людзі. Некалькі юнакоў і дзяўчына па чарзе высвятляюць, хто ж з іх кантактуе з прэсай... Просім паклікаць кіраўніка. Падыходзіць мужчына, не называецца, заўважае толькі, што нядаўна прызначаны на пасаду і што цяпер такія вось будуць правілы.

— Не ведаю, напэўна, мы з вамі да канца гэтага года ўжо не заключым дагавора аб супрацоўніцтве...

— Прабачце, які дагавор? Якое супрацоўніцтва?

— Узаемавыгаднае...

— Усё што нам трэба, гэта проста прайсці на выставу. Калі нешта нам падасца цікавым, мы напішам пра гэта. Калі некаму перашкаджаем, ніколі не настойваем на стасунках, ідзём да іншых, але многія разумеюць, што і ў газеты ёсць свой уласны тэхналагічны працэс вытворчасці...

— Гэта ўсё, што вам патрэбна?.. Тады вы можаце прайсці, але толькі пасля 11 гадзін, пасля адкрыцця выставы.

— А на будучыню... Скажыце, калі ласка, ваша прозвішча, тэлефоны. Дайце візітоўку ці што?

— Падыдзіце пазней, — суразмоўца здымае тэлефонную слухаўку, — бачыце, я заняты...

На выставу мы не пайшлі. Шчыра скажу, працаваць над «наглядам» ахоўнікаў (няўжо нехта з удзельнікаў паскардзіўся, што журналісты настолькі перашкаджаюць ім?) не вельмі прыемна. Хоць асабістыя нашы пачуцці можна і не браць да ўвагі. Хацелася б сказаць толькі вось што. «Звязда» — СТАРЭЙШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА, якая РЭГУЛЯРНА пад рубрыкай «КУПЛЯЙ СВАЁ — ЖЫВІ ЛЕПШ!» змяшчае інфармацыю пра АЙЧЫННЫХ ВЫТВОРЦАЎ, ІХ ТАВАРЫ І ПАСЛУГІ. Матэрыялы з тых жа выстаў выходзяць на ПЕРШАЙ ПАЛАСЕ выдання. МНОГІЯ ІНШЫЯ ГАЗЕТЫ НЕ РОБЯЦЬ ГЭТАГА. Такой магчымасцю незапланавана для сябе змаглі ўжо скарыстацца ДЗЯСЯТКІ БЕЛАРУСКІХ ВЫТВОРЦАЎ. І такі падыход мы якраз лічым УЗАЕМАВЫГАДНЫМ — для газеты, для прадпрыемстваў, для чытачоў!

***P.S.*** *Апошнія пры любым раскладзе не павінны заставацца без інфармацыі. Выстава будзе доўжыцца па 17 кастрычніка ўключна. Экспазіцыі разгорнуты ў павільёнах па вуліцах Янкі Купалы, 27 і праспекце Пераможцаў, 14. Летась у аналагічным форуме бралі ўдзел больш за 180 прадпрыемстваў і фірмаў з шасці краін, яго наведалі больш за 22 тысячы спецыялістаў. Цяперашняе мерапрыемства таксама разлічана найперш на прафесіяналаў, аднак, паўторым некалі сказаныя ўласныя словы, любому чалавеку, які займаецца рамонтам ці добраўпарадкаваннем жылля, таксама будзе што паглядзець: гэтая выстава — адзін з найбуйнейшых спецыялізаваных форумаў у Беларусі. У прыватнасці, звычайных наведвальнікаў можа зацікавіць мэбля для загараднага дома, для адпачынку і турызму. У шырокім асартыменце павінна быць прапанавана мяккая і корпусная мэбля для розных памяшканняў. Звычайна наведвальнікаў цікавяць таксама дадатковыя прадметы абсталявання і інтэр'еру, што дадаюць нашым дамам і кватэрам камфорту і ўтульнасці. Словам, наш звычайны дэвіз: лепш адзін раз пабачыць усё на свае вочы, чым імі ж некалькі разоў прачытаць пра ўсё гэта!*

***P.P.S.*** *Як паабяцалі арганізатары, уваход на выставу будзе свабодным. А паміж выставачнымі павільёнамі для зручнасці наведвальнікаў будуць курсіраваць бясплатныя маршрутныя таксі.*

Сяргей РАСОЛЬКА.

# З БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ ПА ЖЫЦЦІ

Свядомае жыццё чалавека, напэўна, пачынаецца з першых слоў. Свядомае існаванне нацыі — з першых кніжак, якія з'явіліся на яе мове. Свядомы зварот да кніжак, якія напісаны на мове тваёго народа, можа доўжыцца ўсё жыццё, але галоўнае, каб ён быў, каб за чытаннем прыйшло разуменне таго, што хочацца сказаць самому за сябе — на роднай мове. Дзеля гэтага амаль год таму «Звязда» звярнулася да сваіх чытачоў з прапановай: у новым годзе пачаць размаўляць па-беларуску. Аднак ніхто не кажа, што калі пачаў, то прыйдзецца скончыць. Наадварот. Добраахвотная грамадская арганізацыя «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны» лічыць, што трэба працягваць, толькі на іншым узроўні — дзеля таго, каб чалавек, аднойчы звярнуўшыся да сваіх каранёў, стаў сапраўдным патрыётам Радзімы.

*— Мы накіравалі да Прэзідэнта краіны зварот, каб 2010 год у Беларусі абвясціць годам роднай мовы, — кажа* ***старшыня ТБМ Алег ТРУСАЎ.*** *— На днях атрымалі адказ з Адміністрацыі Прэзідэнта, што пытанне разглядаецца і, магчыма, пры гэтым разглядзе будуць улічаны і нашы прапановы. Цяпер якраз думаюць пра тое, які будзе ў нас наступны год. Гэта значыць, што трэба працягваць актыўную працу па прапагандзе беларускай мовы — мы ж не атрымалі адмовы. Значыць, трэба збіраць подпісы грамадзян у падтрымку гэтай ініцыятывы. Што мы і пачнём рабіць у найбліжэйшы час, зробім спецыяльныя бланкі і возьмемся за працу, тым больш, што зараз перапіс насельніцтва. А калі збяром пэўную колькасць подпісаў, то можа і атрымаем рэальны вынік.*

**— Наконт перапісу якія чаканні ў «моўным пытанні»?**

*— Тут могуць быць розныя варыянты. Я спадзяюся, што будзе не горш, чым 10 гадоў таму. А можа і крышачку лепш. Тым больш, што ў грамадстве за 10 гадоў павага да мовы павялічылася. Гэта назіраецца на ўсіх узроўнях. Вось і міністр культуры з'явіўся беларускамоўны — патрыёт. А ён, дарэчы, таксама быў сябрам ТБМ у маладосці. Я яго памятаю яшчэ студэнтам. Вось канкрэтны вынік нашай працы.*

**— Сёлета ў ТБМ юбілейная дата — 20 гадоў існавання. Ці папоўніліся вашы шэрагі і ці адчуваеце вы, што ў людзей вырасла павага да беларускай мовы?**

*— Бясспрэчна. На днях рабілі прэзентацыю вынікаў апытання сацыёлагаў, дык палова жыхароў Беларусі называе патрыётамі тых, хто гаворыць штодня па-беларуску, і ганарыцца імі, хоць самі і не гавораць. Вось і самы найлепшы адказ: зараз як мінімум палова нашых грамадзян ставіцца вельмі станоўча да беларускай мовы. І наогул лічбы аказаліся вельмі цікавыя. Напрыклад, на першае месца па павазе да беларускай мовы выйшла Магілёўская вобласць, самая ўсходняя. Аднак самае важнае вось у чым: нашы думкі і спадзяванні пацвердзілі і сацыёлагі.*

Чамусьці не дзіўна — за 20 гадоў усё-такі людзі змяніліся. Калісьці ініцыятыва стварэння ТБМ у 1989 годзе зыходзіла ад вельмі ўплывовых арганізацый і структур — Саюза беларускіх пісьменнікаў, Міністэрства адукацыі, некаторых інстытутаў Акадэміі навук, Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі ды іншых. Людзі, якія маглі глядзець на свет з шырока адкрытымі вачыма, разумелі, што «моўнае пытанне» не можа быць «вузкім» для грамадства.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Тэлесеткі

# НА «ЕЎРАБАЧАННЕ» — БЯСПЛАТНА?

**Інфармацыя пра тое, што на другую рэпетыцыю і фінальнае шоу дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2009» можна будзе трапіць бясплатна, з'явілася на афіцыйным сайце конкурсу. Нагадаем, адбудзецца песеннае спаборніцтва, у якім сёлета бяруць удзел 13 краін, 21 лістапада ў Кіеўскім Палацы спорту.**

Учора на сустрэчы кіраўнікоў дэлегацый у Кіеве гэту інфармацыю выканаўчы прадзюсар конкурсу Руслан Ткачэнка пацвердзіў. Але адразу ж высветлілася, што «халявы» не будзе — уваход на канцэрты зробяць не свабодным, а па запрашальніках, якія не прызначаны для продажу. Якім чынам яны будуць размяркоўвацца, арганізатары паабяцалі вызначыць у найбліжэйшы час, удакладніўшы, што «мы зацікаўленыя ў тым, каб шоу наведалі як мага больш людзей з розных куткоў Украіны». Таксама быў прэзентаваны сцэнічны дызайн конкурсу, дэталі шоу, абмяркоўваліся арганізацыйныя пытанні — пражыванне, меры бяспекі, праграма «Еўратыдня». Лагатыпам конкурсу абрана «Дрэва жыцця» — сланечнік.

Учора ж адбылася і канчатковая жараб'ёўка ўдзельнікаў конкурсу. Першай выступіць Швецыя, закрые шоу Македонія. Краіна-арганізатар Украіна атрымала ў канцэрце 10-ы нумар. 12-гадовы Юра Дземідовіч, які прадставіць Беларусь з песняй «Чароўны трусік», выступіць перадапошнім, пад 12-м нумарам. Зрэшты, на момант фінальнага шоу Юру ўжо будзе 13 гадоў — 19 лістапада ў хлопчыка дзень нараджэння.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

А я лічу так...

# КАБ НАЗВАЦЬ БЕЛАРУСКУЮ МОВУ РОДНАЙ, ТРЭБА ПАМЫЛІЦЦА?

### КАРОТКІЯ РОЗДУМЫ ДА ПЕРАПІСУ-2009

**Сёння ў нашай краіне пачынаецца перапіс насельніцтва. Гэта надзвычай адказная справа, якая вымагае праявы грамадзянскай адказнасці. Хаця б таму, што на гэта пускаецца шмат дзяржаўных, а значыцца — нашых з вамі грошай. Перапісчыкі ўжо пачалі сваю працу колькі дзён таму: хадзілі па хатах і пазначалі, калі хто будзе дома. Я нават перанёс на дзень камандзіроўку, каб выканаць свой грамадзянскі абавязак — і распавесці статыстыкам, ці ёсць у мяне дома камп'ютар.**

У перапісе мяне напружыла пытанне пра родную мову. Дакладней, яго фармулёўка, якая ўжо пэўны час горача абмяркоўваецца ў грамадстве, на сайтах і форумах.

«Ваша родная мова (мова, засвоеная першай у раннім дзяцінстве)» — так спытаецца ў вас перапісчык. Гэтую фармулёўку (удакладненне ў дужках) я лічу абсалютна непадыходнай для Беларусі. Ужо тыдзень тлумачу сябрам і знаёмым, што гэтай фармулёўкай іх адно блытаюць.

Як можна атаясамліваць родную мову і мову, першай засвоеную ў дзяцінстве? У Беларусі, якая найбольш за іншыя рэспублікі была зрусіфікаваная за савецкім часам, такая фармулёўка ўвядзе ў зман. Бо многія людзі, якія нарадзіліся ў часы камуністаў, засвоілі найперш рускую мову. І толькі калі Беларусь стала незалежнай на пачатку 90-х, усвядомілі, што без сваёй мовы не можа быць сваёй краіны. Прыйшлі да беларушчыны ў сталым узросце. Гэта першае.

Мадэлюем іншую сітуацыю. У раннім дзяцінстве бацькі, як сапраўдныя савецкія людзі, размаўлялі з вамі па-руску. Але вы выраслі добрым беларусам — вывучылі і асэнсавалі гісторыю, культуру, мову нашай зямлі. Лічыце яе роднай. Дык што — хлусіць перакладчыкам і згадваць «мову, засвоеную ў раннім дзяцінстве»? Вядома, не! Найлепш — не зважаць на недарэчную фармулёўку. Падумайце хвілінку, што асабіста вы разумееце пад паняццем «родная мова» — і адказвайце менавіта так.

Родная мова — у маім разуменні — гэта, найперш, мова, якую я сам, без падказак і фармулёвак, лічу роднай. Мова, на якой размаўлялі мой прадзед і мая прабабуля. Гэта мова, на якой я пішу вершы. Мова, на якой я найлепш разумею песні. Мова, на якой прызнаюся ў каханні. Мова, якую лічу самай прыгожай на зямлі.

У розныя часы на нашай зямлі гучалі руская, польская, французская, шведская, нямецкая мовы... Так сталася гістарычна, што беларусы ўмела прыстасоўваюцца да часовых умоў, каб выжываць і заставацца. І калі цяпер наўкол вы чуеце нейкую іншую мову, апроч беларускай, не засмучайцеся — гэта часова. Не верыце? Усе таксама не верылі, што Саюз развaліцца. Калі смажаны певень дзеўбане, калі мы зразумеем, што без нацыянальных адметнасцяў Беларусь проста знікне з палітычнай карты свету — тады будзе трэба і мова, і ўсё астатняе.

Трэці момант. Вы гаворыце і думаеце па-руску. Што пазначаць у гэтым выпадку? Спачатку давайце паставім усё на свае месцы. Вы цвёрда перакананыя, што гаворыце так, бо руская мова вам родная, бо вы «ісцінна рускі чалавек», бо ад беларускай мовы вы адракаецеся свядома? Тады, безумоўна, пішыце рускую. Аднак затрымайцеся на хвіліначку. Калі вы шчыра перакананыя, што гаворыце чыста па-руску, утварыце родны склон ад слова «кочерга» альбо множны лік ад слова «дно».

Дарэчы, падчас мінулага перапісу 85,6 % беларусаў назвалі беларускую мову роднай, з іх 41,3 % пазначылі, што размаўляюць на ёй у хаце.

Вось тут і робіцца зразумелым, чаму фармулёўка «мова, засвоеная першай у раннім дзяцінстве» — памылковая, падманлівая. Хаця б таму, што колькасць людзей, якія лічаць беларускую мову роднай, відавочна будзе большая, чым тых, хто засвоіў яе першай у раннім дзяцінстве. Я асабіста ведаю шмат людзей, якія пачалі размаўляць па-беларуску, лічыць мову роднай ужо ў сталым веку. І з лічбаў мінулага перапісу вынікае: не засвоілі, але родной лічым.

Таму — не забівайце галаву фармулёўкамі і ўдакладненнямі. Слухайце сваё сэрца і голас сваіх продкаў.

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.

Минский городской центр недвижимости

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (организатор аукциона) 23 октября 2009 года повторно проводит открытый аукцион по продаже зданий, сооружений и иного имущества, находящегося в собственности ОАО «Белаттракцион» (продавец).**

На аукционные торги выставляются:

| Номер лота | № 1 | № 2 | № 3 | № 4 |
|---|---|---|---|---|
| **Наименование и характеристики имущества, входящего в состав лота** | - здание административно-хозяйственное, инв. номер 500/С-48231, площадь – 69,6 кв.м;<br>- здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, инв. номер 500/С-48232, площадь – 67,0 кв. м;<br>- ограждение металлическое, протяженность – 470 м;<br>- асфальтобетонное покрытие, площадь – 29,6 кв.м | - здание специализированное иного назначения (павильон), инв. номер 500/С-48537, площадь – 59,3 кв.м | - здание специализированное энергетики, инв. номер 500/С-48263, площадь – 8,9 кв.м | - здание административное инв. номер 400/С-2446, площадь – 178,7 кв.м |
| **Местонахождение имущества** | г. Минск, ул. Ташкентская, д. 25 | г. Минск, ул. Фрунзе, д. 2 | г. Минск, проспект Независимости, д. 84 | г. Гродно, ул. Виленская, д. 20 |
| **Сведения о земельном участке** | площадь – 0,0090 га, кадастровый номер 500000000002006760; назначение – эксплуатация и обслуживание здания специализированного складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; площадь – 0,0074 га, кадастровый номер 500000000002006759, назначение – эксплуатация и обслуживание административно-хозяйственного здания | площадь – 0,0106 га, кадастровый номер 500000000001004775, назначение – эксплуатация и обслуживание здания специализированного иного назначения (павильон) | площадь – 0,0021 га, кадастровый номер 500000000009004063, назначение – эксплуатация и обслуживание здания специализированного энергетики | площадь – 0,0350 га, кадастровый номер 440100000002003160, назначение – обслуживание административного здания |
| **Начальная цена без учета НДС** | 141 953 282 белорусских рубля | 136 019 160 белорусских рублей | 14 845 073 белорусских рубля | 150 032 297 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 14 000 000 белорусских рублей | 13 000 000 белорусских рублей | 1 400 000 белорусских рублей | 15 000 000 белорусских рублей |

**К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект (лот). Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона заключается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта (лота) осуществляется в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **23 октября 2009 года** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с **14.10.2009 по 22.10.2009** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»;**
**(017) 222 73 14 – ОАО «Белаттракцион».**
**Интернет: www.mgcn.by**

Минский городской центр недвижимости

**ОАО «ВИТЕБСКОБЛРЕСУРСЫ» (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)**

**ПОВТОРНО ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже складских помещений с элементами благоустройства, гаражей и иного имущества, расположенного на ул. М. Горького, 197 в г. Витебске, единым лотом. В состав лота входит следующее имущество:**

| № п/п | Наименование объектов | Литер |
|---|---|---|
| 1. | Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-50614 (здание складских помещений) общей площадью 690 кв. м (год постройки – 1969), в том числе составные части: | В1/к |
| 1.1. | Площадка – 1550 кв. м | А |
| 1.2. | Камень бортовой – 115,15 м | а1 |
| 1.3. | Участок ограждения – 7,55 м | б1 |
| 1.4. | Ворота въездные – 5,9 м | б2 |
| 1.5. | Участок ограждения – 12,35 м | б3 |
| 1.6. | Участок ограждения – 2,20 м | б4 |
| 1.7. | Участок ограждения – 118,3 м | б5 |
| 1.8. | Участок ограждения – 2,85 м | б6 |
| 1.9. | Ворота въездные – 5,90 м | б7 |
| 1.10. | Участок ограждения – 30,35 м | б8 |
| 1.11. | Калитка – 1,5 м | б9 |
| 1.12. | Труба дымовая – 1 кв. м | |
| 1.13. | Уборная – 3 кв. м | |
| 2. | Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-50616 (здание гаражей) общей площадью 53 кв. м (год постройки – 1993). | |
| 3. | Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-59952 (сооружение специализированное энергетики – электрическая сеть) протяженностью 233,7 м | |
| 4. | Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-59951 (сооружение специализированное энергетики – тепловая сеть) протяженностью 83,1 м | |

Земельный участок площадью 0,2681 га, кадастровый номер 240100000003000118 предоставлен в постоянное пользование для содержания и обслуживания существующих зданий по ул. М. Горького, 197 в г. Витебске.

Начальная цена лота – 311 773 392 белорусских рубля без учета НДС.

**К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 30 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта (лота) осуществляется в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа. Аукцион состоится **23 октября 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с **14.10.2009 по 22.10.2009** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017)227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»;**
**(0212)27 23 16 – ОАО «Витебскоблресурсы».**

**Коллектив Минского городского центра недвижимости и фонда «Минскгоримущество» выражает искренние соболезнования главному бухгалтеру Минского городского центра недвижимости АЛИМПИЕВОЙ Елене Петровне в связи с постигшим ее горем – смертью мужа.**

## Дзень работнікаў фармацэўтычнай і мікрабіялагічнай прамысловасці

# АД СЛОВА ДА СПРАВЫ — АДЗІН КРОК



## Нясвіжскі завод медпрэпаратаў не стамляецца ўвасабляць у жыццё ўсё новыя і новыя праекты




Укладчыкі-ўпакоўшчыкі Іна ДРАЧАН і Святлана ЛАШУК кантралююць якасць наклейвання этыкетак.


Дырэктар Сяргей ПРАСМЫЦКІ.

Мы ўжо не першы год наведваем прадпрыемства і не перастаём здзіўляцца: тое, што яшчэ летась было ўсяго толькі накідам на паперы — сёння ўжо рэальныя аб'екты, якія спраўна працуюць і задаюць тон усяму заводу. Не так даўно нават і не ўяўлялася, як гэта — каб цялежкі з растворамі самі заязджалі ў стэрылізатар, а этыкеткі наклейваліся аўтаматычна. Сёння нас гэтым не ўразіць — на гэтым прадпрыемстве ўсё так і павінна быць! Вось паглядзіце, ужо запушчаная другая чарга вытворчасці інфузійных раствораў па тэхналогіі Bottlepack (выдзьмуванне, разліў і запайка стэрыльных раствораў у поліэтыленавыя ёмістасці). Цяпер такім чынам выпускаецца 10 млн флаконаў на год — як і праектавалася. Растворы даступныя і ў новых аб'ёмах, уся лінейка — 50, 100, 250 і 500 мл. Пашырыўся і асартымент: сярод прэпаратаў, якія разліваюцца на новай лініі, з'явіліся ацэсоль, дзісоль і хласоль. Ёсць навінкі і ў шкляных флаконах: сёлета прамыслова выпусцілі растворы на аснове гідроксіэцілкрухмалу (6- і 10-працэнтны), метранідазол таксама ўжо ідзе ў серыі, раскупляецца. Нясвіжскія медпрэпараты пашырылі абсягі экспарту і ўключыліся ў распрацоўку прынцыпова новай прадукцыі, пры гэтым тут не забываюцца на энергаэфектыўнасць і заахвочванне калектыву — і як толькі ўсё паспяваюць?! Падрабязнасці высвятляем у дырэктара Нясвіжскага завода медыцынскіх прэпаратаў Сяргея ПРАСМЫЦКАГА, з лёгкай рукі якога нават самыя смелыя задумы становяцца явай.

### ГАНДАЛЬ БЕЗ МЕЖАЎ

— Мы выйшлі на новы рынак экспарту — Азербайджан — пастаўкі на два прадпрыемствы здзейсненыя на агульную суму больш як 380 тыс. долараў, — расказвае кіраўнік завода. — Гэта вельмі перспектыўны і плацежаздольны рэгіён. Нядаўна пабывалі ў Малдове на спецыялізаванай выставе, спрабуем знайсці там партнёраў, каб таксама рэалізоўваць сваю прадукцыю. Там ёсць попыт на інфузійныя прэпараты, бо Малдова ўсё ж знайшла ў сабе мужнасць перайсці на растворы заводскай вытворчасці паўтара года таму і свята гэта выконвае. І яны гатовыя купляць.


Будуюцца новыя найсучаснейшыя складскія памяшканні.

Увогуле ж экспарт па выніках васьмі месяцаў сёлета вырас ажно на 124 працэнты. Пры гэтым найвялікшы аб'ём прадукцыі адгружаецца ў Казахстан. А самы дынамічны — рынак Узбекістана, дзе прырост склаў 378 працэнтаў. Аднак, як ні дзіўна тое прагучыць, з сакавіка практычна спыніўся гандаль з Расіяй...

— Цэны на растворы ў Расіі паўзуць і паўзуць уверх, але тыя, што прапануюць партнёры за нашу прадукцыю, — нават ніжэйшыя за ўзровень нашых пастаянных выдаткаў, — тлумачыць парадаксальную сітуацыю Сяргей Прасмыцкі. — У такім выпадку мы не змаглі б акупляць прамыя затраты, таму гандаль пакуль давялося прыпыніць. Хоць працэс рэгістрацыі прэпаратаў у Расіі ў нас не спыняўся.

«Прабел» у структуры знешняга гандлю, які ўзнік з-за гэтых недарэчнасцяў, запаўняецца за кошт росту па іншых кірунках і з'яўлення новых. Тым больш, што ўмовы супрацоўніцтва з расійскім бокам ніколі не адрозніваліся асаблівай спрыяльнасцю.

Сёння Нясвіжскае прадпрыемства прадумвае аб новых рубяжах — рынках заходнееўрапейскіх краін, і гэта, па ўсім відаць, не мяжа. А ад задумы да справы, як мы ведаем, у іх толькі адзін крок — руплівая праца. Чаканае пашырэнне экспартных кірункаў робяць магчымым новыя стандарты якасці.

### GMP — ЗНАК ЯКАСЦІ

— На заводзе ўведзены цэх па вытворчасці інфузійных раствораў па тэхналогіі Bottlepack, якая адпавядае стандарту GMP (good manufacturing practice — належнай вытворчай практыкі), — кажа дырэктар завода. — У свой час праект прайшоў кваліфікацыю на адпаведнасць патрабаванням GMP, цяпер мы працуем над правядзеннем сертыфікацыі вытворчасці на адпаведнасць GMP і атрыманне адпаведных сертыфікатаў — як беларускага, так і міжнароднага. Атрыманне такіх сертыфікатаў дазволіць пашырыць рынкі збыту нашай прадукцыі, з'явіцца магчымасць пастаўляць яе ў Прыбалтыку і Польшчу.

Найбольш акрэсліўся пакуль менавіта польскі кірунак.

— Па-першае, краіна па суседстве — дастаўляць бліжэй, па-другое, па цане мы там вельмі канкурэнтаздольныя, — расказвае Сяргей Прасмыцкі. — Плюс да таго, Bottlepack — гэта традыцыйная ў Польшчы ўпакоўка для інфузійных раствораў. Яны да гэтага прызвычаіліся і задаволеныя. А лекі, як вядома, — рэч вельмі кансерватыўная. Калі многія нашы людзі прызвычаіліся да анальгіну, то якую альтэрнатыву ім не прапаноўвай, яны ўсё адно будуць замаўляць у аптэках анальгін. А адна з фірмаў, якая працуе на польскім рынку, пераходзіць на PVC-пакеты, яны не падабаюцца медперсаналу, які таксама вельмі кансерватыўны. Таму да нас звяртаюцца, і мы пачалі ўжо працэдуру рэгістрацыі ў Польшчы. Гэта зойме як мінімум паўтара года. Польскія інспектары павінны асабіста пераканацца ў тым, што вытворчасць на нашым заводзе сапраўды адпавядае стандарту GMP.


Адноўленая актавая зала — гонар прадпрыемства.

**ВІНШАВАННЕ ДЫРЭКТАРА:**

**Шаноўныя калегі! Шчыра віншую вас з прафесійным святам — Днём працаўнікоў фармацэўтычнай і мікрабіялагічнай прамысловасці. Зычу вам гармоніі, дабрабыту і вельмі-вельмі моцнага здароўя — няхай уласная прадукцыя патрабуецца нам самім як мага радзей! Узаемаразумення вам для плённай сумеснай працы на карысць нашай агульнай, высакароднай справы.**

**Сяргей ПРАСМЫЦКІ.**

### 70:30

Развіваецца не толькі знешні гандаль — унутраны рынак таксама падрос. Па выніках працы за восем месяцаў гэтага года рэалізацыя павялічылася на 30 працэнтаў. Скарачаюцца аб'ёмы складскіх запасаў. Аднак крызіс, зразумела, не абмінуў Нясвіжскі завод медпрэпаратаў.

— У сувязі з тым, што мы выпускаем прэпараты для прымянення ў стацыянарах бальніц, у нас у аптэках практычна нічога не прадаецца, мы вельмі моцна залежым ад мясцовых бюджэтаў, — працягвае кіраўнік прадпрыемства. — Яны забяспечваюць фінансаванне раённых бальніц. І паколькі адбылося ўразанне іх бюджэту ажно на 20 працэнтаў, то ў нас сталі зніжацца аб'ёмы продажаў унутры краіны, пачынаючы з ліпеня. Фінансавання не хапае.


Майстар змены Наталля ШАПАВАЛ робіць другі выбарачны кантроль раствораў на механічныя ўключэнні (ворс і г.д.).


Раман ДАЦУРА назірае за аўтаматызаваным стэрылізатарам.

Грошай на інфузію на трэці квартал у бальніцах ужо няма, яны б'юцца над тым, каб ім перакінулі фінансаванне з чацвёртага квартала... А галоўнае, што з-за гэтага пакутуюць людзі.

Істотнай кампенсацыі за кошт экспарту прадпрыемству чакаць не даводзіцца: прыбытковая частка заўжды фарміравалася ў прапорцыі 70:30 (дзе 70 даводзіцца на ўнутраны рынак, і 30 — на экспарт). Вялікім цяжарам леглі на завод курсавыя розніцы.

— Субстанцыі і расходныя матэрыялы мы набываем за валюту за мяжой, — кажа Сяргей Прасмыцкі. — І ўлічваючы дэвальвацыю, якая адбылася, мы па выніках двух першых месяцаў цярпелі страту. Аднак выкарыстоўваючы магчымасць, якую нам далі, — не выплачваць поўнасцю амартызацыю па новым цэху — крыху больш за 200 млн беларускіх рублёў штомесяц (паводле ўказа кіраўніка дзяржавы на працягу 2009 года прамысловым прадпрыемствам дазваляецца не налічваць амартызацыю, а пераразмеркаваць яе на наступны справаздачны перыяд — налета. — **Аўт.)**, мы неяк выйшлі на рэнтабельную работу. І на сёння ў нас рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі — сем працэнтаў (па выніках васьмі месяцаў). Гэта нават больш, чым летась (тады яна не перавышала 5,8 працэнта).

### ВА ЎСІМ ПЕРШЫЯ

Належная ўвага надаецца тут ахове працы. Для майстроў з аддзялення прагляду, якія ўвесь працоўны дзень аглядаюць змесціва флаконаў у пошуках механічных уключэнняў у зацемненым памяшканні пры спецыяльным асвятленні, фатарый — святое. Дзённае святло дае вачам адпачываць. Крыху расслабіліся — і зноў за працу: узялі два флаконы, перавярнулі і прагледзелі пры святле на чорным і белым фоне (ці адзін, ці другі абавязкова будзе кантрасным для нейкіх там варсінак, якія маглі патрапіць у раствор). І так 350 (!) бутэлек за гадзіну. Такая норма ў супрацоўніц, расказаў нам начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела Аляксандр НІКІФАРАЎ. Ён дадаў, што прэпараты на заводзе праходзяць трохузроўневы кантроль. Калі адшукваюцца нейкія механічныя ўключэнні, растворы не шкадуючы адбракоўваюць...

Заробкі супрацоўнікаў за апошні год павышаліся чатыры разы, і сёння сярэдні месячны прыбытак па заводзе — 885 тыс. рублёў. Ці варта казаць, што па гэтым паказчыку прадпрыемства лідзіруе ў раёне.

— Гэта стала магчымым, калі правялі невялікую аптымізацыю колькасці супрацоўнікаў з увядзеннем новай вытворчасці, — тлумачыць дырэктар Нясвіжскага завода медпрэпаратаў. — Проста скарацілася вытворчасць у шкляной бутэльцы. Мы б з задавальненнем павышалі заробкі яшчэ, аднак на нас жа яшчэ вісяць цяжкім грузам штомесячныя выплаты банку па крэдыце, які мы бралі пад рэканструкцыю — гэта больш за мільярд рублёў. Прытым штомесячны фонд заробкаў — 500 млн. Атрымліваецца, два заробкі па заводзе мы аддаём банку штомесяц. Стаўкі па крэдытах у нашай краіне — велізарныя, аднак развівацца трэба, больш нічога не застаецца...

Пабываўшы ў стыльнай дызайнерскай актавай зале, афармленай у досыць актуальнай цяпер філетавай гаме, мы ўпэўніліся — з грамадскім складнікам на заводзе ўсё ў парадку. І высветлілася, што інтарэсаў у калектыву сапраўды багата. Напрыклад, сярод тутэйшых фармацэўтаў шмат выдатных футбольных гульцоў. Каманда Нясвіжскага завода стала чэмпіёнам вобласці па футболе і чэмпіёнам рэспублікі па міні-футболе сярод аматарскіх камандаў. Цяпер мясцовыя Бэкхамы і Ранальдзіньявыя гуляюць у найвышэйшай лізе. Безумоўна, апроч лаўраў гэта прыносіць і пэўныя фінансавыя выдаткі...

Сёлета завод наведаў прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі, азнаёміўся з новай вытворчасцю. А тым, хто працуе, пераадольваючы цяжкасці, і нягледзячы на многія недарэчнасці паказвае неблагія вынікі, — і палёгкі сякія-такія зрабіць не грэх. Вось тры будынкі завода былі перададзеныя на баланс Нясвіжскай ЖКГ.

— Гэта палепшыць наша фінансавае становішча ў будучыні, — адзначае Сяргей Прасмыцкі. — Пакуль што гэта не так заўважна, бо паводле ўмоў перадачы нам трэба зрабіць капітальны рамонт дахаў на гэтых трох дамах, на што давядзецца выкласці каля 250 млн рублёў. Для нас гэта сур'ёзнае ўкладанне.


Майстар змены Аляксандр ВІШНЕЎСКІ.


Зоя КУЗНЯЦОВА, начальнік цэха медыцынскіх прэпаратаў і іншай прадукцыі, і Аляксандр НІКІФАРАЎ, начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела.

### ЭНЕРГААЎТАНОМНАСЦЬ

На заводзе разумеюць, што сучасная вытворчасць павінна быць яшчэ і энергаэфектыўнай. Сама па сабе тэхналогія Bottlepack, на якую цяпер прыпадае асноўная доля прадукцыі, прадугледжвае вялікую эканомію энергіі. Бо пры вытворчасці ў шкле яшчэ не так даўно быў вельмі цеплазатратным працэс падрыхтоўкі таразакарковачных матэрыялаў, вады для ін'екцый. Апошні ўяўляе двайную дыстыляцыю — гэта значыць, двойчы трэба пераганяць, каб атрымаць апірагенную ваду для ін'екцый. Таму прадпрыемства па інавацыйным фондзе летась набыло ўстаноўку зваротнага осмасу — каб зменшыць спажыванне дыстыляванай вады, выкарыстоўваючы для падрыхтоўкі таразакарковачных сродкаў ваду ачышчаную. А на чым атрымліваецца эканоміць пры вытворчасці па тэхналогіі Bottlepack?

— Там сістэма атрымання вады — шляхам фільтрацыі, без награвання, — кажа Сяргей Прасмыцкі. — Плюс, мы яшчэ падтрымліваем чысты пар ва ўстаноўцы па дыстыляцыі. Да таго ж, упакоўка ў пластыку не патрабуе падрыхтоўкі таразакарковачных матэрыялаў. Вось параўнайце, для таго, каб падрыхтаваць шкляную бутэльку, яе трэба вымыць гарачай ін'екцыйнай вадой (на адну бутэльку ідзе 2,5 літра). У поліэтылене ўжо на гэтым эканомія. Адзінае, што ў нас цяпер расце, — расход электрычнасці: на новай вытворчасці вельмі вялікі аб'ём кандыцыянавання паветра. Аднак эканомія энергіі ў цэлым усё адно адчувальная: каля чатырох тыс. кубоў газу штомесяц. Цяпер ідзе тэндар на пакупку сучаснай дыстыляцыйнай установкі, якая таксама дасць рэальную эканомію ў газе. Аднак мы тут стараемся, эканомім энергію, а расійскі бок збіраецца штрафы выстаўляць за недабор газу. Ці ж гэта не нонсенс?


За якасцю раствораў сочыць Алена ЛУК'ЯНЧЫК.

Ідэальным выйсцем з недарэчнай сітуацыі стала б энергетычная аўтаномнасць прадпрыемства. І ў кіраўніцтва на гэты конт ужо ёсць планы:

— Плануем стварыць на базе нашага завода кагенерацыйную ўстаноўку магутнасцю да 4 КВт. Тады мы зможам самі прадуцыраваць электраэнергію для сваіх патрэбаў і нават аддаваць частку ў агульную сістэму. І паколькі гэта будзе з абсарбацыйнай установкай, мы зможам атрымліваць яшчэ і холад. А гэта вельмі актуальна ў рэчышчы нашых планаў... Цяпер вось шукаем грошы. Бізнэс-план і тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне ўжо зрабілі, яно прайшло экспертызу ў камітэце па энергаэфектыўнасці Міністэрства па ахове навакольнага асяроддзя. Цяпер аддаём яго ў выканкам — можа там нечым нам дапамогуць...

### НЕ ЗАМУЖАМ, ЖЫЛЛЁМ ЗАБЯСПЕЧАНА

Ад нашага пільнага вока не схавалася, што на заводзе вельмі шмат маладых людзей — спрытных, ініцыятыўных, са свежым поглядам на працу. Фатаграфуем маладую супрацоўніцу, высвятляем імя, прозвішча, каб падпісаць фотаздымак, яна называе і хутка дадае «не замужам, жыллём забяспечана» — і тут жа заліваецца гучным смехам. Зазначым, што з гендарным балансам на прадпрыемстве ўсё ў парадку — маладых мужчын тут таксама шмат. Карацей, сумаваць у калектыве не даводзіцца.

— Завод вельмі істотна папаўняецца маладымі спецыялістамі, — пацвердзіў нашы назіранні дырэктар. — Сёлета прынялі на працу 13 чалавек, летась — 9. Пераважна гэта выпускнікі тэхналагічнага, радыётэхнічнага ўніверсітэтаў і БДУ (хімічнага факультэта). Нам даводзіцца прымаць на працу людзей са сумежных спецыяльнасцяў і тут, на месцы, іх навучаць. У краіне рыхтуюць фармацэўтаў для аптэк, бальніц, — толькі не для прамысловай вытворчасці. Наладжваем ужо тут, на месцы, курсы, ідзе перадача вопыту сталых калег, навучанне праводзяць таксама спецыялісты, якія ўсталёўвалі новае абсталяванне — так і выкручваемся. У новым цэху працуюць пераважна маладыя спецыялісты, людзі старэйшыя — на так званай старой вытворчасці (у шкляной тары). Мы яе, дарэчы, таксама збіраемся рэканструяваць — з уласных сродкаў. Ужо заключаны дагавор на пакупку новай лініі разліву, якая таксама будзе адпавядаць GMP, палепшацца і ўмовы працы. Мы правялі карэнную рэканструкцыю і рамонт аддзялення прагляду і ўпакоўкі. Планамерна ідзе добраўпарадкаванне тэрыторыі. Апранаемся ў асфальт пакрысе, налета зробім фасад у адзіным інтэр'еры, каб усё было прыгожа, ахайна. Калі ніхто не перашкодзіць, то ўсё рэалізуем.

### «ЯЙКАВАЯ» І «МАЛОЧНАЯ» ФАРМАЦЭЎТЫКА

Ёсць у прадпрыемства і новыя смелыя задумы. Плануецца сёлета правесці перазарадку гама-ўстаноўкі, павялічыць яе магутнасць і, безумоўна, павысіць прадукцыйнасць. Ёсць попыт на паслугі па стэрылізацыі і апрамяненні. Напрыклад, некаторыя айчынныя крэмы для твару праходзяць цераз гама-ўстаноўку (дзе яны трапляюць пад антыбактэрыяльнае ўздзеянне). Асобны корпус плануецца адвесці пад склад, які вырашыць сур'ёзную праблему, — пакуль што складскія памяшканні даводзіцца арандаваць.

— Склад будзе адпавядаць усім сучасным еўрапейскім патрабаванням, стандарту GMP, — запэўнівае кіраўнік прадпрыемства.

Разам з Аляксандрам Нікіфаравым мы пабывалі на будоўлі, якая паводле плана ўжо зусім хутка — у лютым — ператворыцца ў сучаснае складское памяшканне на тры тысячы палета-месцаў. Як расказаў наш «гід», склад таксама будзе аўтаматызаваны: «Дастаткова ўвесці на апараце патрэбную серыю — і неабходныя скрыні пададзеныя».

Новаму складу — новая прадукцыя. Ужо аддадзеныя на рэгістрацыю ў Міністэрства аховы здароўя кардыяплягічныя растворы (№ 1, № 2, № 3). Як патлумачыў нам Сяргей Прасмыцкі, гэтыя растворы прымяняюцца для правядзення аперацый на адкрытым сэрцы. Паводле яго слоў, попыт на кардыяплягічныя прэпараты будзе расці, бо ў Беларусі такіх аперацый праводзіцца ўсё больш і больш. У кожным абласным цэнтры павінна быць створана па кардыяцэнтры, а ў Мінску іх ужо чатыры. Раней кардыяплягічныя прэпараты — распрацоўка НДІ кардыялогіі — рабіліся ў аптэчных умовах...

— Цяпер мы шукаем субстанцыю для моксіфлаксацына 0,16-працэнтнага — гэта фторхіналонавы антыбіётык шырокага спектра дзеяння чацвёртага пакалення. У нашых планах таксама далейшая распрацоўка той наменклатуры, якая сёння льецца ў аптэках. Каб у рэшце рэшт у Беларусі скончыць унутрыаптэчную вытворчасць інфузійных раствораў і карыстацца выключна растворамі прамысловай вытворчасці. Ніхто ў свеце ўжо такога не робіць, акрамя Беларусі. Але, на жаль, у сувязі з тым, што адбылося ўразанне бюджэтаў, у аптэках льюць усё больш і больш раствораў... Чым гэта небяспечна? У нашай прамысловай вытворчасці сертыфікаваныя ўсе працэсы, плюс чатыры кантрольна-аналітычныя лабараторыі, плюс прэпараты правяраюцца на таксічнасць і пірагеннасць у віварыі. Ніхто ў бальніцах не трымае ні мышэй, ні трусоў для таго, каб даследаваць прэпарат спачатку на іх, перш чым уводзіць яго чалавеку. Элементарнае даследаванне на пад'ём тэмпературы не праводзіцца, а людзі потым пакутуюць ад гарачкі...

Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў жвава цікавіцца міжнароднымі напрацоўкамі. З нядаўняй паездкі ў Швецыю вярнуліся з цікавай ідэяй — ствараць тлуставыя прэпараты, амінакіслоты з... яек! У скандынаўскай краіне на вытворчасць фармацэўтычных субстанцый ідзе 50 працэнтаў вытворчасці яек.

— Нам патлумачылі тэхналагічны працэс, — дзеліцца ўражаннямі Сяргей Прасмыцкі. — Там у прынцыпе практычна поўнае выкарыстанне яек, нават шкарлупіны ідуць у ход. Чаму б нам не пераняць іх вопыт, яек у Беларусі хапае.

Не менш актуальны кірунак — вытворчасць малочнакіслых бактэрый для малочнай прамысловасці (для закваскі, сыру, кефіру і іншай прадукцыі). Малака ў нашай краіне таксама ўдосталь.

— Наш галоўны інжынер Наталля Маркачэўская была ў Даніі, — паведаміў нам кіраўнік прадпрыемства. — Такой вытворчасці, як у іх, няма ні ў адной краіне на прасторы СНД — усе закупляюць БАК-прэпараты ў датчан.

Сёння ж ёсць планы адкрыць у Беларусі ўласную вытворчасць. Асобны завод будзе ўтвораны на базе НЗМП, паколькі раней тут быў біязавод, гэта таксама мікрабіялогія, кадры яшчэ засталіся з тых часоў.

— Інстытут мяса-малочнай прамысловасці цяпер распрацоўвае доследны ўчастак для вытворчасці ў сябе, а тут ужо будзем рабіць завод, — тлумачыць дырэктар. — Для нас як для завода фармацэўтычнага гэта тэма цікавая. Бо ў прынцыпе малочнакіслыя бактэрыі — гэта тыя ж самыя прабіётыкі. Калі на малочную вытворчасць яны пойдуць у замарожаным выглядзе, то ў фармацэўтычнай вытворчасці іх трэба высушыць і дадаваць у прадукты харчавання ці так проста прымаць як біяфлору. А ўвогуле новая вытворчасць — гэта ж і развіццё пасёлка Альба, горада Нясвіжа, з'яўленне новых працоўных месцаў, укараненне новых тэхналогій, імпартазамяшчэнне.


Тэхнолаг Ірына СМІРНОВА.

Прапрацоўваецца магчымасць запусціць на базе асобнага корпуса вытворчасць сістэм для захоўвання крыві, перэнтаральнага харчавання на аснове амінакіслотаў. Дарэчы, пад апошні праект ужо нават ёсць інвестар, вытворчасць будзе з нямецкім капіталам. Цяпер пад гэта ствараецца бізнэс-план. У хуткім часе мы, відаць, усё гэта пабачым. Не сумняваемся, што і гэтыя накіды ўвасобяцца ў жыццё.

**Зоя ВАРАНЦОВА, Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

УНП 600031159.


У пакоі адпачынку кантралёры Святлана СЕНЬ і Ганна ГАЛЬШТЭЙН.

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 31 (77)

# МАМІНА ПАРАДА



**Да Дня маці**

**Наталля ВОЎК з двухгадовай дачкой Віялетай. Пасёлак Азёрны, Жыткавіцкі раён.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Віталь ГРЫНКЕВІЧ

# ПАКУЛЬ ЁСЦЬ ДАРОГА З БАЦЬКОЎСКАГА ДОМА

(Навела)

З гадамі ўсё больш па душы размераны лад жыцця. Хочацца спакою, лагоды, яднання з прыродай, а не паўсядзённай гарадской мітусні. Вось і Рыгор, у свае за сорак, імкнецца часцей бываць у роднай вёсцы. Звычайна прыязджае позна ўвечары. Ідучы па дарозе ад электрычкі, удыхае водар сваёй маленькай радзімы. «Пахне як той восенню...» — і пад няспешны крок успамінае «тую восень», імгненні мінулых гадоў. Родны дом сустракае яго сваімі пахамі. Яны нагадваюць пахі з маленства. І Рыгор учэпіста хапаецца за гэты водар жылога дома, з гаркаватым прысмакам паху кніг, пажоўклых раман-газет і фотаздымкаў ужо мінулага стагоддзя. Ён памятае амаль забытыя пахі рускай печы. Цяпер з даўно нячышчанага коміну патыхае сажай. А раней печ грэла і цяплом, і апетытнымі пахамі няхітрай сялянскай ежы: аладак, баршчу, бульбяной «бабкі», салонікаў са смажаным салам і цыбуляй... Да дома падведзены газ, стала больш зручна і проста: не трэба ездзіць у лес, нарыхтоўваць, пілаваць, калоць дровы, складваць іх у роўныя шнуры. Гэтая праца адпала, забыўся клопат, а вось водар смалістай хвоі — памятаецца...

З-за пагорка паказаліся першыя хаты вёскі. Яшчэ некалькі соцень метраў — і Рыгор кранецца рукою знаёмай брамкі. У доме свеціцца акно. Гэта бацька глядзіць па тэлевізары апошнія навіны. Усё, як і раней, па заведзеным распарадку. За выключэннем таго, што раней Рыгора заўсёды першай сустракала мама. А пасля яе смерці дом неяк апусцеў, напалову.

Мама, мамачка... Рыгор памятае, як заходзіў у дом, перапранаўся з дарогі і пакуль выкладваў з сумкі гасцінцы, мама ўжо спяшалася накрыць на стол. За вячэраю яна дзялілася вясковымі навінамі, сын — гарадскімі.

А песні! І за сталом, і проста так. Як задушэўна гучалі яны ў маміным выкананні! У дзяцінстве Рыгора — часта, у дарослыя гады — зрэдку. Але калі мама спявала, значыць, усё было добра — і ў дзяцей, і ў бацькоў.

Мама ўвесь час была ў працы і клопатах. Яна ўмела ўсё. Сярпом жаць, падушкі і пярыны набіваць, вышываць карціны, плесці сумкі. Дом патанаў у кветках, грады і агарод прапалатыя, паўсюль чысціня і парадак, як і належыць акуратнай гаспадыні.

Рыгор стараўся часцей гаварыць маме «дзякуй», падбадзёрваў яе кампліментамі. Яна тады нібыта маладзела, усміхалася і адказвала, што, маўляў, яшчэ і не такое можа. Хто б у гэтым сумняваўся?! У цябе былі залатое сэрца, залатая душа, залатыя рукі, мама. Але дзе ты змагла знайсці, намыць столькі залацінак дабрыні, мамачка?

Да ўсяго ёй была справа: дзяцей — апрануць, абуць, накарміць, а ўжо дарослым і сямейным усунуць неўпрыкмет для бацькі грошы ў руку: унукам на прысмакі. Вось так жыла і працавала, каб дзецям яе жылося лепш. Цяпер жа Рыгор жыве дзеля таго, каб яго дзеці жылі лепш... Так і працягваецца на гэтым свеце...

Мінула некалькі гадоў, як не стала мамы. Але Рыгор не можа звыкнуцца з тым, што гаворыць пра маму ў мінулым часе... «Была». Некалі гэтае слова мела зусім іншае адценне. Часам, калі гарталі фотаальбомы, мама казала: «Глядзі, якая я ў маладосці была. Вось мы, маладыя, усміхаемся — усе вясковыя настаўнікі. Бачыш, мода шасцідзясятых: двухбортныя пінжакі ў мужчын і амаль аднолькавыя паркалёвыя сукенкі ў жанчын». У альбом кожны год дадаваўся вялікі здымак, на якім былі мама і тата з вучнямі — яго рабіў фатограф на добрую памяць. А памяць у мамы была фенаменальная. Штогод столькі вучняў у кожным класе, столькі выпускаў — і ўсіх яна памятала па імені і прозвішчы. І не толькі памятала, але магла распавесці, дзе хто зараз працуе, якая ў каго сям'я.

Маму, настаўніцу рускай мовы і літаратуры, калегі паважалі, вучні любілі. Праз дзесяцігоддзі былыя выдатнікі і двоечнікі — вусатыя, лысыя, крыху распаўнелыя мужчыны, статныя жанчыны, калі прыязджалі на вечары сустрэчы выпускнікоў, узгадвалі яе добрым словам. І шчыра дзякавалі за любоў і мацярынскае стаўленне да іх, за майстэрства, з якім выкладала свой прадмет.

Як у гэтым жыцці ўсё закальцавана! Цяпер у Рыгора мама засталася толькі на фотакартках, ва ўспамінах і ў душы. Даўно пайшоў ён з бацькоўскага дома ў самастойнае жыццё, а праз шмат гадоў зноў і зноў вяртаецца, ідзе па дарозе дамоў. А ўсё чаму? Ды таму, што для Рыгора ёсць пакуль з бацькоўскага дома дарога.

...У царкве, у памінальнай рысавай кашы, усыпанай зверху цукеркамі, гарыць свечка. Аплывае воск, свечка ўсё меншая і меншая. Хутка яна дагарыць. Агеньчык знікне. Дарэчы, усё знікае, заканчваецца на гэтым свеце. Вось і паніхіда скончылася. Пасля таго, як перахрысціўся і пакланіўся абразам, Рыгор выходзіць з храма і едзе на могілкі. І кажа «Добры дзень, мама!» магільнаму крыжу.

Віктар ШНІП:

# «МОЛАДЗЬ ДАРЭМНА БАІЦЦА ДРУКАВАЦЦА Ў «МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ»

**Віктар Шніп — паэт, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, прэміі імя Уладзіміра Маякоўскага Савета Міністраў Грузіі, літаратурнай прэміі «Залаты Купідон» — сёння з'яўляецца галоўным рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура». Ён на ўласным вопыце пераканаўся, што выдаваць творы іншых аўтараў можа толькі той, хто піша сам. Размову з Віктарам Анатольевічам мы пачалі з сённяшняй беларускай літаратуры ўвогуле.**



***— Віктар Анатольевіч, ці ёсць мэйнстрым у сучаснай беларускай літаратуры?***

— У нас зараз плённа працуюць тры асобныя плыні літаратараў: старэйшае пакаленне, сярэдняе і моладзь. Тыя пісьменнікі, якія жылі пры Савецкім Саюзе, да саракагоддзя выдавалі аднатомнік выбранага, да пяцідзесяцігоддзя — двухтомнік. На сёння яны, можа, і пакрыўджана глядзяць на гэты свет, бо зараз цяжка выдаць кніжку, даводзіцца і за свой кошт. І народныя пісьменнікі, і многія лаўрэаты дзяржаўных прэмій сёння нават да сваіх юбілеяў нічога не маюць. Гэта пра старэйшае пакаленне.

Сярэдняя плынь — гэта маё пакаленне. Калі мы былі маладыя і глядзелі на старэйшых, прыкідвалі: «Будзе мне 40 гадоў — выйдзе добры том, у 50 будзе два...» На жаль, так не адбылося, і многія мае аднагодкі (Віктар Анатольевіч нарадзіўся ў 1960 годзе. — **Аўт.**) маюць на сёння па тры-чатыры кніжкі максімум. Узяць Андрэя Федарэнку, Алеся Наварыча, Барыса Пятровіча, Алеся Аркуша, Алега Мінкіна... Уладзімір Сцяпан актыўна друкуецца ў часопісах, але кніжак мала мае.

***— Чаму так адбываецца?***

— У той багаты цягнік, які ішоў, мы не паспелі, а той, у якім павінны былі камфортна ехаць, не стварылі. Час вырашае за нас. У 1990-м мне было 30 гадоў. Анатолю Сысу ў 1989-м было 30. Магчыма, і ён па-іншаму жыў бы, калі б Саюз не развалюўся. Я не кажу, што гэта вялікая бяда. Гэта добра, што Беларусь стала незалежнай краінай. Але многія тады разгубіліся і выпалі з цягнікоў.

Трэцяе пакаленне — маладзейшыя, — каму ад 20 да 35: Андрэй Хадановіч, Глеб Лабадзенка, Сяргей Балахонаў, Марыйка Мартысевіч і іншыя. Яны ўжо ў выдавецтва «Мастацкая літаратура» не ідуць. Спакойна выдаюць свае кніжкі ў «Галіяфах», у Логвінава і іншых. Дзякуй Богу, што ёсць гэтыя выдавецтвы. У нас, у «Мастацкай літаратуры», вельмі вялікія патрабаванні. Мы мераем той меркай, якой у свой час мералі Мележа, Шамякіна, Караткевіча. Маладыя, зразумела, пад гэтую мерку падыдуць не ўсе, бо іх літаратура больш разняволеная, больш эксперыментальная. Але гэта не сведчыць пра тое, што яна нам чужая.

І, на жаль, кола аўтараў, якія прыходзяць у выдавецтва, змяншаецца. А калі павялічваецца, то за кошт тых, хто раптам пачаў пісаць у 50-60 гадоў.

***— Як вы адбіраеце тых, каго друкаваць, каго — не?***

— Мы пісьменнікаў не выбіраем. Сёння, напісаўшы твор, напачатку сам пісьменнік выбірае, дзе будзе выдаваць кніжку. А прыйшоўшы да нас у выдавецтва, ён павінен забыцца пра свае ранейшыя заслугі, бо мы паблажак нікому не даём: ні маладым, ні лаўрэатам. Для нас усе роўныя, бо галоўнае — якасць мастацкага твора. З радасцю прымаем тыя творы, якія ўжо друкаваліся ў часопісах «Маладосць» , «Полымя» і іншых выданнях, што маюць аўтарытэт. У нас ёсць серыя «Вера, надзея, любоў». Тры кніжкі выйшла. Праз іх прайшло каля 50 аўтараў. У кожнага свой стыль і сваё каханне. Зараз я збіраю чацвёртую кнігу і прапаную маладзейшым даць свае творы.

Шкада, што моладзь, апошнім часам, не спяшаецца ісці да нас. Відаць, ведае, што ў большасці мы друкуем тыя творы, якія стануць хрэстаматыйнымі. А эксперыментальныя творы ніколі не стануць хрэстаматыйнымі. Усе пісьменнікі напачатку эксперыментуюць, а пасля прыходзяць да выпрабаваных класічных нормаў.

***— Назавіце некалькі прозвішчаў сучаснікаў, якія вартыя выдавацца ў «Мастацкай літаратуры».***

— Са старэйшай плыні літаратараў кожны можа друкавацца. І з майго пакалення амаль у кожнага такія творы ёсць. А маладыя яшчэ эксперыментуюць. Але і яны выходзяць, калі не асобнымі кніжкамі, дык у зборніках. Вось мы зараз рыхтуем да выдання дзіцячую кніжку Веры Бурлак. У нас выйшлі першыя кніжкі Зміцера Вішнёва, Югасі Каляды, Алены Брава, Аксаны Спрынчан, Усевалада Гарачкі, Рагнеда Малахоўскага, Наталлі Кучмель, Зміцера Арцюха. Добра, што з'яўляюцца новыя аўтары, якія не баяцца эксперыментаваць. Я сам эксперыментую, нешта мяняю, шукаю. Нельга стаяць на адным месцы і сёння пісаць так, як пісаў учора.

Праца выдавецтва залежыць ад «Перспектыўнага плана», які кожны год мы складаем і рассылаем па бібліятэчных і кнігагандлёвых арганізацыях. У гэты план трапляюць тыя аўтары, чые кніжкі мы збіраемся выдаць. У нашым плане на наступны год каля 160 назваў. Выдадзім недзе толькі палову: грошай на ўсіх не хопіць. Якія рукапісы набяруць больш тыражу па бібліятэках, тыя і выйдуць. Выключэнне робім толькі для серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі» (ЖЗЛБ), але і ў тым выпадку, калі ведаем, што хоць выданне на сённяшні дзень не набрала патрэбны тыраж, але яно будзе запатрабаванае заўтра.

***— Ці ёсць у Беларусі добры сучасны дэтэктыў?***

— У нас ёсць серыя «Сучасны беларускі дэтэктыў». Мы адкрывалі яе «Каронай Вітаўта», дзе было змешчана каля дваццаці аўтараў, сярод якіх Адам Глобус, Уладзімір Сіўчыкаў, Віктар Праўдзін, Людміла Рублеўская, Міраслаў Шайбак. Потым у гэтай серыі выйшлі асобныя кнігі Людмілы Рублеўскай, Віктара Праўдзіна, Сяргея Трахімёнка і Леаніда Маракова.

***— Ці друкуе «Мастацкая літаратура» зараз замежных аўтараў?***

— У нас ёсць серыя «Скарбы сусветнай літаратуры». Выдаём недзе па адной кніжцы ў год. Цяпер падрыхтаваныя да друку гістарычныя аповесці паляка Крашэўскага ў перакладзе Міхася Кенькі. Стараемся друкаваць невядомыя творы, якія яшчэ не выходзілі на рускай мове. Хаця і самі выдаём 5% літаратуры на рускай. Гэта больш рускамоўныя паэты, крыху ёсць і прозы. Да нас нярэдка звяртаюцца аўтары з Расіі, але, на жаль, такія, якіх не хочуць друкаваць ні ў Маскве, ні ў расійскіх абласных цэнтрах. Зразумела, і мы іх не друкуем.

На сёння палова нашых выданняў адрасаваная дзецям. Багата ілюстраваных кніжак з прыгожым афармленнем. У год выходзіць прыкладна 40 назваў для дзяцей. Ды мы цяпер не адны выдаём. Холдынг «ЛіМ» шмат выдае такой літаратуры.

***— Не баіцеся канкурэнцыі?***

— Нас гэта прымушае больш фантазіраваць, шукаць. Але часам перамаўляемся з «ЛіМам», каб не перабегчы ім дарогу. Часам, калі прыдумаем нешта новае, выдаём у тайне, каб не перахапілі. Гэта добрая канкурэнцыя. Яна спрыяе развіццю і стымулюе.

***— Што цяпер рыхтуецца да друку?***

— У серыі «ЖЗЛБ» рыхтуецца (спадзяюся, выйдзе ў першым паўгоддзі наступнага года) кніжка пра жыццё і творчы шлях Івана Шамякіна. Рыхтуюцца выданні і пра Аркадзя Куляшова, Максіма Багдановіча. Праз месяц выйдзе кніжка пра Янку Купалу «Купалаў вянок». Яе напісаў Уладзімір Ліпскі. Мікола Маляўка, які працуе ў часопісе «Вясёлка», зараз піша і друкуе там раздзелы з будучай кнігі пра Якуба Коласа.

Ёсць у нас серыя «Казкі XXI стагоддзя». Распачалі яе ў мінулым годзе, бо многія пісьменнікі пачалі пісаць казкі, а мы прывыклі чытаць толькі народныя. Гэтыя кнігі карыстаюцца попытам.

Да канца года выйдзе кніжка з новай серыі «Беларусь музычная» пра кампазітара Яўгена Глебава. Кнігу рыхтавала і пісала яго жонка. Думаю, серыя працягнецца. Карыстаюцца попытам серыі «ЖЗЛБ», «Мастакі Беларусі» і «Нашы Героі».

***— А ці ёсць каму пісаць такія серыі?***

— Вось толькі і бяда, што няма. Звярталіся да нас і Аляксандр Цiхановіч, і Васіль Раінчык, і Ігар Лучанок: «Выдайце пра мяне кнігу»? — «Выдадзім, вы толькі знайдзіце таго, хто яе напіша». Калі выдавалі кніжку пра Міхаіла Фінберга, цяжка было збіраць матэрыял. І ўсё ж сабралі!

У серыіі «Нашы героі» выйшла кніжка пра генеральнага канструктара МАЗа Міхаіла Высоцкага. Яму зараз за 80 гадоў. Такія кніжкі — гэта летапіс нашай краіны. Некалі па іх будуць вывучаць гісторыю.

***— Нядаўна вы выдалі «Мінск: падарожжа па горадзе».***

— Гэта такая гульня. Наша супрацоўніца падобную набыла ў Чэхіі. Мы ўбачылі і вырашылі выдаць такую ж. Гульня дапамагае дзецям вывучаць славутыя мясціны, помнікі горада. Там напісана, дзе знаходзіцца манумент, каму пастаўлены, чым герой праславіўся, што напісаў, расказваецца, чаму так называюцца плошчы, у гонар каго названыя вуліцы...

***— Вы планавалі выдаць такія ж гульні, прысвечаныя Гродну і Барысаву. Атрымалася?***

— З-за гэтага сусветнага фінансавага крызісу крыху затрымаліся. Але аўтары працуюць над гэтымі кніжкамі. Мы самі іх заказвалі. Зараз яшчэ заказалі лаўрэату Дзяржаўнай прэміі Алесю Марціновічу кнігу «Герб, сцяг і гімн Беларускай дзяржавы». Мы выдавалі такую кніжку для дзяцей. Яна карысталася попытам. Цяпер хочам выдаць для дарослых: турысты цікавяцца.

***— У вас была практыка выдання літаратуры на дысках. Яна працягваецца?***

— Гэта мы рабілі не для шырокага кола чытачоў, а для школ. Выйшлі тры дыскі. Яны былі і гукавыя, і візуальныя. Першы быў з вершамі Караткевіча. Там і яго голас гучаў, песні, інтэрв'ю. Пасля выдалі электронную кнігу пра Якуба Коласа і дыск па сучасным беларускім мастацтве. З яго можна карціны на ўроках паказваць на экране. Але наша галоўная задача — выдаваць кніжкі на паперы.

***— Адна мая знаёмая дзяўчына-бард на пытанне «Ці не плануеш выдаць свае вершы?» адказвае: «А навошта?». Што б вы ёй адказалі?***

— Выдаваць, каб падзяліцца. Пісаць для сябе — гэта што запасы на зіму рабіць. Нарыхтаваў яблыкаў і бульбы — і сам з'еў. А надрукаваныя творы — гэта тая садавіна, тыя кветкі, якія ты аддаеш. Трэба дзяліцца. Тады ты адчуваеш сябе больш патрэбным. Няхай і не ўсе прымаюць, але ёсць людзі, якія цікавяцца, якія чакаюць тваіх новых твораў. Мне часам нечакана прыходзяць лісты ад удзячных чытачоў. А здавалася б, зараз ужо лісты не пішуць. Творчасць патрэбна не толькі таму, хто ёй жыве. У першую чаргу — таму, хто чытае. Яна дапамагае людзям.

**Таццяна САЛДАЦЕНКА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# СЕНА МАЛАДОЕ

БЫВАЮЧЫ ў вёсцы, калі ўчую пах сена, дык адразу згадваю маленства. Усе прыемныя пахі адтуль. У раннія гадочкі на іх асаблівая памяць. А ў познія... «Штаны пахнуць старасцю», — напісаў адзін мой сябра-літаратар.

Сена пахне маленствам ды юнацтвам. Скасіць чысценька вострай коскай лужок — усё адно што зрэзаць тонкім лязом вузу са старанна запаяных пчоламі сотаў. Мёд стаіць у іх загусцелым сонцам. Зрэзаныя найбліжэй да карэньчыкаў сцябліны травы таксама свецяцца бурштынам. І галавакружна пахнуць. У тым ліку і мёдам. Памятаю, бацька выкасіў абвіты зумканнем і павеўным водарам клубочак чмяліных сотаў: лугавога мядку там была якая грамулька, а непаўторным водарам надыхаўся ўволю — на цэлае жыццё.

Сена заўсёды маладое, не мае ў мінулым, лічы, аніякага запасу часу, хіба два-тры дні, якія пайшлі на высушванне. Інакшым, апроч як маладым, яму проста не дадзена быць. Калі ты ўзняў на вілах добры ахапак і з яго закуродыміў не драбнюткі кветкавы пылок, а інакшы — аседлівы, цемнаваты, як з якой трухі, дык гэта ўжо і не сена наогул. Яно не скручваецца ў мяккі клубок, а з шоргатам сячэцца на колкія іголкі. Толькі калгасная карова ў бяскормную зіму з пакорлівым рыкам магла схіліць над такім галаву.

«Старое сена» — гэта недарэчнасць. Уявіце сабе, што які зласлівец вам, спраўнаму гаспадару, пажадаў: «А каб ты ўвесь век кароўку старым сенам карміў ды ейнае малачко піў...».

Маладое сена майго дзяцінства нарыхтоўвалі, як у нас казалі, «на няўдобіцы», там, дзе не мог прайсці трактар з касілкай, ці яму, каб скасіць траву падчыстую, трэба было надта пакруціцца паміж хмызоўя. Гэтую «няўдобіцу» — хто ж дасць сеянай канюшыны! — і дзялілі на «шнуры» для ўласных каровак калгаснікаў. Хадзілі па лугавых лапіках з «кавялой» зазвычай тры спрактыкаваныя ў гэтай адказнай працы вяскоўцы і дзялілі. Адзін нёс лазовыя колічкі з напісанымі на счасаных «лысінах» хімічным алоўкам нумарамі, другі куляў «кавялу» з двухметровым «крокам», гэтую незаменную прыладу для палявых замераў, трэці пазначаў у сшытку толькі яму вядомай «шыфроўкай», дзе месціцца той ці іншы шнур па парадку.

Падзяліць няўдобіцу пароўну было вельмі няпроста — гэта ж вам не раўнюткі пасля меліярацыі абшар на ўчастку нарэзаць. Вось і абмяркоўвалі мужыкі, што вялі дзяльбу, як падступіцца да таго ці іншага лапіка сенакосу.

— А не, Васіль, тут трэба якую сотку накінуць, — заклапочана казаў Мікола. — Ты ж паглядзі, якая травіца рэдкая, а вунь лапік свінухі няешчай... Трэба накінуць!

Мужыкі стараліся, каб усе прыблізна накасілі пароўну. Але ж хіба патрапіш, нават Бог няроўна дзеліць...

Увечары, калі каровы вярталіся з пашы, вяскоўцы збіраліся каля якой-небудзь хаты цягнуць жэрабя — нумаркі шнуроў, якія пісалі на акуратна нарэзаных палосках вучнёўскага сшытка, скручвалі іх, каб нічога не было бачна, і клалі ў знятую з галавы шапку каторага ўдзельніка дзяльбы. Вядома ж, і мы, падшыванцы, прыходзілі з бацькамі. Жэрабя цягнулі для таго, каб менш крыўдна было з-за якой няўдалай дзялкі: маўляў, так выпала па волі лёсу, так наканавана, відаць... Але ўсё адно ў многіх было расчараванне, гаркота прыкрасці на душы — надта ж сур'ёзна ставіліся вяскоўцы да назапашвання сена. Яшчэ б! Дагодзіш карміцельцы — будзе раскашаваць на салодкім малацэ сям'я. А паспрабуй дагадзіць ёй з травастою «няўдобіцы»...

— Ат, халера! Ізноў, як летась, балацяністы шнурок выцягнуў... Асочка, толькі па ўзмежках трошкі дзятліны, які пракосік... Па хмызах давядзецца блэндаць, выкошваць па ахапачку ды звозіць з зацені дадому, на двары сушыць, — перажываў скрушны дзядзька.

Плошча сенакосу на «няўдобіцы» была абмежаваная: скасіў свой шнурок, потым шнурок атавы і, калі бачыш, што недастаткова кароўцы на зіму, дык і «блэндай» па якіх лапічках паміж хмызоў, падкошвай па пракосіку... А лепш рабі гэта загадзя.

Нам, падлеткам, якія ўжо прымерваліся да клопатаў будучых касцоў, таксама карцела далучыцца да такога захапляльнага вясковага ўзрушэння, як выцягванне жэрабя. Мы таўкліся сярод дарослых, услухоўваліся ў гаману, перажывалі разам з усімі кожны ўскалых так і не вытраўленых з абагуленых сялянскіх душаў уласніцкіх пачуццяў. Але такога дачынення нам усё адно было мала. Мы таргалі бацькоў за рукавы, крыссе пінжакоў ды ўпрошвалі: «Татулечка, дай мне выцягнуць нумарок, каб пашчасціла... Дай мне!». Так, да нясцерпнасці хацелася як мага хутчэйшага далучэння да зморнага сялянскага выраку.

А якое ж было расчараванне і нават адчай, калі з літасцівага дазволу бацькі ты нарэшце выцягваў жэрабя, а яно не спраўджвалася ў лепшых спадзяваннях, аказвалася такім, як і ўся сялянская доля. Замест дзятліны ды мурагу — асочка ды конскае шчаўе... І тады раніцай, калі ты са сваёй літовачкай подбегам даставаўся следам за бацькам да няўдалага шнура (а пра тое, што там няешчая трава, было ўжо добра вядома з роспытаў ды ранейшага досведу), хацелася, каб доўгая сцежка вілася паміж хмызоўя цэлы дзень, да самага прыцемку.

...Калі той колішні расчараваны няўдачай малец упершыню ў горадзе пабачыў такую куродымна-грымотную антытэзу бацькавай літоўцы, як газонакасілка, ён не мог не адчуць у душы цеплыню вясёлай уцехі. Яму здавалася, што так выявілася вышняя помста няешчай траве не толькі на той калгаснай «няўдобіцы», але на ўсім травастоі Зямлі!

Апалагеты навукова-тэхнічнага прагрэсу нават падабралі спецыяльныя травы і шматлікім перасейваннем на сітах ды перавейваннем у паветраных бруях адабралі беззаганнае насенне, праз якое назаўсёды адпрэчылі ад дзедаўскай касы газонную траву. Яна ж стаіць сцяблінка да сцяблінкі, усё адно як спецыяльна падабраныя, смарагдавымі нітачкамі... Каторая нітачка і кроплю расы ўтрымаць не можа, сагінаецца ў дугу, кволая, і міжволі аддае долу цяжар вільгаці. Дык як жа касіць такі луг расою, калі няма ўпэўненасці, што яна, світальная раса, сапраўдная, а не дзеля дэкору гарадскога двара? Як рабіць узмах на ўсю сілу, калі трэба толькі далікатна брыць шчаку зямлі, каб не парэзаць дзярніну? А тады, што гэта за касьба, калі не зазнаеш знямогі?

САПРАЎДНАЯ касьба — гэта калі стамляешся так, што сеўшы ў пракос палуднаваць, толькі таму маеш сілу паднесці скібку хлеба да рота, што на ёй ляжыць духмяны скрылёк прытрыманага на гарышчы да касавіцы кіндзюка ці трохі таўсцейшая луста кумпяка з непаўторным мацiцовым водсветам... А да таго ж гэтыя прысмакі простыя прынесены ў абед маленькай дачкой ці сынком, прыладжаныя любымі ручкамі...

Адным словам, аніяк не выходзіць касіць старанна адбітай ды памянташанай літовачкай газонавую роўнядзь, бо гэтая літовачка, як ні махай, не выгукне свой вжыкавы посвіст, не задрыньчыць сталёвай пругкасцю на закалянелых сцяблінах... Тут, як ні старайся, колькі ні націскай на «пятку», усё адно не выкасіш паэтычную купіну чмялінага зумкання...

Апроч усяго, на крывашыпна-шатуновым апараце можна навучыцца касіць і без бацькі! Уявіце сабе!

Пры сапраўднай касьбе толькі ў бацькі можна навучыцца як след, з адцягам, кляпаць касу на самым світанні ці познім вечарам, пасля працы няспешна, роўнымі ўдарамі малатка напаўняючы вясковы абшар звыклым, як само жыццё, ляпаннем. Немілагучным, але ўсё ж усцешным, як заўсёды ўсцешны надзейны працяг.

Сапраўдная касьба пужае нехапнасцю разлогу, цяжарам узвышанай зеляніны, дык таму і неабходна, каб хто ўпэўнены ў сабе рашуча ішоў паперадзе ў наступ на тое, чаго баяцца вочы. Найлепш, калі гэта бацька!

Памятаю, у рускага пісьменніка Віктара Астаф'ева падчас тэлесустрэчы запыталіся чытачы, што ён думае пра шчасце, па чым яго вызначае?

Віктар Пятровіч зусім ненадоўга сцішыўся, а потым сказаў:

— Шчасце — гэта калі маленькія дзеці...

Толькі і ўсяго! А потым крыху патлумачыў: тады, маўляў, і самі бацькі яшчэ маладзенькія, а жыццёвыя турботы не надта задушальныя...

Цяпер я ведаю: а яшчэ шчасце — гэта калі ў цябе малады, дужы бацька. Такі, як падчас касьбы сена, калі ён ідзе наперадзе. О, які шырокі разварот плечукамі, якая цвёрдая постаць, які ўпэўнены крок... Бацька — і гэта наша лёсавая пазнака — зазвычай косіць у салдацкай сподняй кашулі, такой звыклай і, здаецца, на жаль, такой незаменнай. Ён ідзе першым, каб уразацца не толькі ў высокую, пераблытаную чубамі траву, але і ў тваю памяць — пажыццёва...

І ты запомніш пляму поту на спіне, на белым тле ягонай кашулі, пляму, якая засведчвае соль сялянскага жыцця.

Сваёй хадой на касьбе за бацькам ты адчуеш і хаду часу, і нават ягонае нечаканае паскарэнне. Яно выявіцца ў тым, што твой пракос пакрысе будзе шырэць, рабіцца больш выструненым, валок — больш нагрувашчаным, а зрэз — куды як гладзенькім, амаль такім, як у татулькі. І тады ты міжволі пачнеш мацней націскаць на «пяту» літоўкі, каб яшчэ больш зраўняцца з галоўным чыннікам важнай дзеі.

Аднаго разу, калі ты на світанку вернешся дадому пасля таго, як праводзіш з танцаў у суседнюю вёску сваю светлавалосую прысуху, як патаўчэш з ёю ў ахвотку ў пуні маладое сена ейнага бацькі, а потым дома заснеш на світанку на якую гадзінку (які там сон — адны згадкі) і ў пару выйдзеш на луг, станеш следам за бацькам у пракос, ты раптам адчуеш, што нягледзячы на зморную ноч, сілы ў цябе зусім не меней, чым учора, а грудзі распірае дагэтуль невядомае пачуццё глыбіні прасцягу... А потым заўважыш, што пакрысе даганяеш бацьку і ўжо неўзабаве, як бывала ў вяскоўцаў, калі касілі талакой, давядзецца, трохі знііякавеўшы, выгукваць: «Асцярожна, пяты падрэжу!..» І з гэтай прычыны душу тваю пачнуць поўніць супярэчлівыя пачуцці: з аднаго боку прыемна спазнаць у сваіх руках дагэтуль нязнаную натхняльную дужасць, а з іншага... «Падрэзаць» бацьку — значыць самому прымерацца да ролі верхаводы. А гэта ж усё адно што са сваёй волі развітацца з бесклапотным юнацтвам... Вось і прыпыняешся ў пракосе, даўжэй чым звычайна мянташыш касу, потым, няхай сабе з невялікай ахвотай, п'еш і п'еш са збанка прыхоплены з дому бярозавік...

Але куды больш цікава, з гумарам, па-народнаму напісаў пра касьбу з бацькам паэт В. Мыслівец — нездарма ж ягоныя радкі былі прыкмечаны кампазітарам А. Чыркуном і выліліся ў песню. Іх немагчыма працытаваць часткова — толькі цалкам:

*У панядзелак раніцай*
*Сена маладое*
*Касіў бацька, касіў я,*
*Мы касілі двое.*
*У аўторак раніцай*
*Сена маладое*
*Сушыў бацька, сушыў я,*
*Мы сушылі двое.*

*У сярэду раніцай*
*Сена маладое*
*Бацька зносіў, я зграбаў,*
*Працавалі двое.*
*Раніцаю ў чацвер*
*Сена маладое*
*Вазіў бацька, вазіў я,*
*Мы вазілі двое.*

*У пятніцу раніцай*
*Сена маладое*
*Прадаў бацька, прадаў я,*
*Гандлявалі двое.*
*У суботу увесь дзень,*
*Сена маладое,*
*Гуляў бацька, гуляў я,*
*Мы гулялі двое.*

*А кароўку чым карміць,*
*Дзе ўзяць сырадою?*
*Плача бацька, плачу я,*
*Плачам мы абое.*
*У панядзелак, як тады, ой*
*Сена маладое*
*Касіў бацька, касіў я,*
*Мы касілі двое.*

Аўтар верша ўдала закальцаваў хаду часу ў духмянай капешцы паэтычнай нязгаснасці.

Задума напісаць гэтыя лірычныя нататкі з'явілася ў мяне сёлетнім летам, калі падчас гасцявання ў роднай вёсцы ўдыхнуў павеў з маладога сена, якое цягнуў канёк высозным бухматым возам. Зноў згадалася маленства, калгасныя брыкі, на якіх мы, вясковыя мальцы, звозілі ў час канікулаў пад невымерна вялізную шаху капешкі з поплава, падзараблялі грошы на вучобу. Цяпер і шахі той няма, і брыкаў, якія ў іншых мясцовасцях называюць няўклюдным словам «драбіны».

ДЫ і як мне, жыхару сёмага паверха, не згадваць сваё вясковае мінулае, калі з вышыннага вакна зноў і зноў бачу, як выходзіць на дваравы лужок работнік камунгаса ў памаранчавай камізэльцы. Цераз плячо ў яго перакінута шырокая дзяга, на ягой падвешана пераносная механічная касілка. Зусім відавочна, што ягоная прылада звінчана на ўзор звычайнай касы, нават пасярэдзіне штангі мае дзяржальні накшталт своеасаблівых палюкоў. І косяць ёю гэтак жа — з развароту, па сектары круга...

Выходзіць, вось і маем пацешны прыклад, калі горад, па сутнасці, тэхнічна ўвасобіў, пераняў спрадвечны дзедаўскі спосаб касьбы, даволі прымітыўна скапіяваў яго ў механічнай схеме...

Я міжволі пачаў узірацца ў камізэлькавага маладзёна і прыкмеціў: іншым разам ён з асаблівым імпэтам адводзіць касілку за спіну, трохі прысядаючы, усё адно як ад напружвання ў густым высокім травастоі, вядзе ёю па зямлі... З лёгкасцю пазнаў у гэтым касцы нядаўняга вяскоўца. А можа, яму што прыемнае згадалася з даўнейшай касьбы на бацькавым лузе?.. Хто ведае.

А мне дык з нагоды згадалася існа маладое сена з духоўнага зачыну майго жыцця. У акуратным, падраўняным з краёў ахапачку мама нанач прыносіла яго з пунькі ў хату і рассцілала на стале пад абразамі. Потым клала туды бохан хлеба і накрывала сена новым кужэльным абрусам. Я ўтрапёна глядзеў на маміну дзею з прадчуваннем светлазорнага дзіва. І яно заўсёды прыходзіла, а больш дакладна — яна, ноч перад Раством Хрыстовым. Назаўтра мама ўставала ранелька і перамешваючы шэпт малітвы з шапаценнем скамшанага пад пахай сена, выносіла свой пачастунак карове Рабоні, а ў дадатак яшчэ і акрайчык святочнага хлеба. А пасля таго, як бацькі ўходжваліся па гаспадарцы і мы ўсе разам садзіліся снедаць за святочны стол, над ім усё яшчэ павеўна лунаў пах сена — маладога, маладога... І гэты пах яднаў непарыўным вязьмом усіх нас — сямейнікаў, быдлу, Ісуса Хрыста, народжанага ў яслях, усё існае ў абноўленым, прыкметна памаладзелым свеце.

**Сяргей РУБЛЕЎСКІ, пісьменнік.**

*Віцебск.*

# Мінск запаліў «зялёнае святло»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Праўда, паклапаціцца аб рэгістрацыі павінен сам грамадзянін. У адваротным выпадку ён можа быць прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці. Першым разам гэта будзе проста папярэджанне. А другі выяўлены факт пражывання без рэгістрацыі на працягу года пасля папярэджання закончыцца штрафам ад 2 да 4 базавых велічынь. Або на сёння — штрафам ад 70 да 140 тысяч рублёў.

— У іншагародніх грамадзян ёсць два варыянты рэгістрацыі — па месцы жыхарства або па месцы знаходжання, — працягвае Наталля Ясінская. — Так, для рэгістрацыі па месцы жыхарства ў Мінску давядзецца пашукаць свабодную жылплошчу: 20 квадратных метраў, або ў выпадку пасялення ў інтэрнатах — 6 «квадратаў». Для рэгістрацыі ж па месцы знаходжання пошукаў свабодных квадратаў не трэба, дастаткова толькі знайсці ўласніка жылога памяшкання.

Непасрэдна тэрмін рэгістрацыі па месцы знаходжання абмежаваны годам. Аднак ніхто не забараняе праз той жа год перарэгістравацца зноў. І так — практычна да бясконцасці. У сувязі з гэтым прапановы «прапісацца» за вялікія грошы выглядае прынамсі недарэчнай. Асабліва калі ўзяць пад увагу вядомы факт: у большасці жыхароў іншых рэгіёнаў у сталіцы ёсць сваякі.

**ПЕНСІЙНЫ СТАЖ НЕ ПРАПАДЗЕ**

Не з'яўляюцца слушнымі спасылкі на адсутнасць сталічнай рэгістрацыі і яшчэ з адной прычыны. Сама па сабе гэта акалічнасць не можа з'яўляцца падставай для якіх-небудзь абмежаванняў работнікаў з іншых рэгіёнаў па аплаце працы. Ці па магчымасцях карыстання тымі ж гарантыямі калектыўных дагавораў. Правы іншагародніх работнікаў нічым не адрозніваюцца ад правоў работнікаў-мінчан.

— Пры гэтым тыя ж іншагароднія могуць карыстацца бальнічнымі, дэкрэтнымі водпускамі, занятасць у сталіцы абавязкова пойдзе ў пенсійны стаж — паколькі ўсе работнікі падлягаюць дзяржаўнаму сацыяльнаму страхаванню, — зазначае Наталля Ясінская. — І, дарэчы, ніякай рызыкі, што ў выпадку несупадзення месцаў жыхарства, рэгістрацыі і працы звесткі аб сацстраху куды-небудзь «знікнуць», няма. Бо з пачатку 2003 года ў нас уведзена сістэма персаніфікаванага ўліку адлічэнняў. Прычым банк гэтых звестак — агульны па краіне.

**ХТО ПАТРАБУЕЦЦА СТАЛІЦЫ?**

Адмаўляць у прыёме на працу з прычыны адсутнасці сталічнай рэгістрацыі нельга. Аднак нялішне заўважыць, што канчатковае рашэнне тут у любым выпадку залежыць выключна ад наймальніка. Бо той жа наймальнік выбірае, ці патрэбны яму канкрэтны спецыяліст. Так, кожную адмову можна аспрэчыць у судзе. Разам з тым падчас разбору давядзецца прывесці пэўныя аргументы. Між тым, сабраць такія аргументы складана, дастаткова сказаць, што паводле заканадаўства пісьмовыя тлумачэнні аб матывах адмовы наймальнікі абавязаныя даваць толькі некаторым катэгорыям — у прыватнасці, грамадзянам, што накіроўваюцца на ўладкаванне па размеркаванні ці ў лік броні службы занятасці, работнікам, што запрашаюцца ад аднаго наймальніка да другога пераводам, жанчынам з прычыны цяжарнасці або наяўнасці дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў, адзінокім маці, якія маюць дзіця ва ўзросце да 14 або дзіця-інваліда — ва ўзросце да 18 гадоў.

І ўсё ж нельга не адзначыць: нягледзячы на верагоднасць адмовы, шанцы на ўладкаванне ў сталіцы іншагародніх дастаткова вялікія. Ужо з адной прычыны. Паводле аператыўных звестак, сёння ў Мінску налічваецца прыкладна 4,9 тысячы беспрацоўных. Але адначасова — і 13,9 тысячы свабодных месцаў. Магчыма, сярэдні ўзровень аплаты працы па вакансіях і не надта высокі — у межах 700-800 тыс. рублёў. Але, напрыклад, у сярэдзіне года амаль кожнае пятае запрашэнне на працу было «падмацаванае» больш чым мільёнам.

Пры гэтым, як заўважаюць у камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, найбуйнейшаму гораду краіны патрабуецца дастаткова вялікая колькасць рабочых будаўнічых спецыяльнасцяў, слесараў, вадзіцеляў і машыністаў, рабочых-станочнікаў, мантажнікаў, электрыкаў-электраманцёраў, зваршчыкаў, гандляроў. А таксама — спецыялістаў аховы здароўя, выхавальнікаў, бухгалтараў, тэхнікаў, супрацоўнікаў міліцыі, загадчыкаў, кіраўнікоў і начальнікаў структурных падраздзяленняў, майстроў і прарабаў.

**Сяргей ГРЫБ.**

# ПРЫПЫНЕНЫ «АЎТАМАБІЛІСТ»

**Працягваючы турнэ па неабсяжных расійскіх прасторах, хакейны клуб «Дынама-Мінск» пакінуў Еўропу. Мяжа паміж нашай часткай свету і Азіяй праходзіць акурат па заходніх раёнах Екацерынбурга каля Верх-Ісецкага возера. Менавіта да мясцовага «Аўтамабіліста» — дэбютанта Кантынентальнай хакейнай лігі — і наведаліся мінчане ў панядзелак.**

Каб выйсці са стану ступару, гаспадарам спатрэбіўся добры дзясятак хвілін. За гэты час мінчане не раз маглі павялічыць перавагу, але лік застаўся ранейшым. Другі перыяд адзначыўся больш асэнсаванымі атакамі екацярынбуржцаў, якія на 26-й хвіліне «прабілі» ўсё ж Коваля (Віталь выйшаў на лёд, даўшы адпачыць Андрэю Мезіну). Пераломным момантам усёй гульні можна назваць самы пачатак апошняй трэці: з інтэрвалам у дванаццаць секунд з пляцоўкі былі выдаленыя Уэскат (за штуршок суперніка на борцік) і Дзянісаў (выкід шайбы). Амаль дзве хвіліны мінчане змагаліся ўтрох супраць поўнай пяцёркі гаспадароў. Антоненка некалькі разоў, Сітнікаў, Гуляўцаў — спрабавалі, але ні ў кога не атрымалася перайграць Коваля. Там жа, дзе Віталь быў бяссільны, дапамагалі абаронцы. Выстаяўшы ў меншасці, «бела-блакітныя» праз некалькі хвілін трэці раз запалілі чырвоны ліхтарык за спінай Франскевіча і тым самым забяспечылі сабе другую запар перамогу ў гасцях.



Вялікая ўвага да гэтай каманды з боку беларусіх заўзятараў тлумачыцца, безумоўна, не яе статусам дэбютанта. З гэтага сезона за екацярынбургскую каманду выступае адзін з лідараў нацыянальнай зборнай нашай краіны Алег Антоненка. Прычым, не проста выступае, а з'яўляецца адным з лідараў уральцаў. На рахунку беларуса восем балаў у адзінаццаці гульнях. Дарэчы, закідваў Алег і ў апошніх двух паядынках — маскоўскім і рыжскім дынамаўцам. Мінская ж каманда пасля ўпэўненай і прыгожай перамогі ў папярэднім туры над «Трактарам» рыхтавалася да гульні ў не менш добрым настроі.

Пачатак застаўся за «бела-блакітнымі». На другой хвіліне гаспадары засталіся ў меншасці, але выкарыстаць добрую магчымасць распачаць лік у дынамаўцаў не атрымалася. Затое праз некалькі хвілін ужо ў роўных складах Хювенен прайшоў па левым флангу і не пакінуў шанцаў галкіперу гаспадароў Франскевічу. Не прайшло і паўтары хвіліны, а Дзянісаў кідком ад сіняй лініі зрабіў лік на табло 2:0 на карысць «Дынама». Такога пачатку «аўтамабілісты» дакладна не чакалі.

Падчас шматгадзіннага пералёту з Екацярынбурга ў Мінск дынамаўцы ўсім сваім інтэрнацыянальным натоўпам смела могуць развучыць словы песні з рэпертуару «Песняроў». Згадзіцеся, Уладзімір Мулявін наўрад ці пакрыўдзіўся б на тое, што, падымаючыся ў неба над яго родным горадам, мінчане зацягнулі «Бывайце здаровы, жывіце багата, а мы ад'язджаем дадому, дахаты». Ад'язджаем, падняўшыся на восьмае месца ў Заходняй канферэнцыі.

**Яўген ВАРАКСА.**

**Здарэнне**

# Жанчына-кіроўца загінула, пасажыркі параненыя

**Трагедыяй скончылася паездка трох маладых жанчын на аўтамабілі.**

Як паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях, днём на аўтадарозе ў вёсцы Новая Палата Полацкага раёна 28-гадовая кіроўца «Опеля» не справілася з кіраваннем, у выніку чаго аўто апынулася ў кювеце, урэзалася ў дрэва. Жанчына, якая пражывала ў вёсцы Бабавікі Полацкага раёна, памерла на месцы аварыі.

Пасажырка аўто — 24-гадовая ўладальніца аўтамабіля, аднавяскоўка загінулай, атрымала пералом нагі. Таксама траўму нагі атрымала яшчэ адна пасажырка — 25-гадовая жыхарка Полацка. Іх шпіталізавалі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


**г. ВИТЕБСК** **17.11.2009**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ**

**НАЧАЛЬНЫЕ ЦЕНЫ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ СНИЖЕНЫ НА 20 %**

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Капитальное строение с инвентарным номером 210/С-11360 – здание нежилое (здание склада грузового прирельсового с рампой), расположенное по адресу: Витебская область, Браславский район, Друевский с/с, п. Друя, и право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное кирпичное здание, перегородки кирпичные, крыша а/волнистая, общая площадь 385,6 кв.м, бетонные крыльца, бытовое помещение – общая площадь 46 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 220882710005000001 для размещения объектов железнодорожного транспорта – для обслуживания склада грузового прирельсового с рампой, площадь 0,1276 га, срок аренды 40 лет. Использование – для обслуживания здания склада. | **75 775 941** | **7 577 594** |
| 2. | Капитальное строение с инвентарным номером 201/С-11334, расположенное по адресу: Витебская область, Городокский район, г. Городок, ул. Вокзальная, 40а, и право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 201/С-11334 – здание специализированное розничной торговли (магазин) – одноэтажное кирпичное здание 1974 г. постройки, общей площадью 457,2 кв.м, фундамент бетонный, перекрытия – ж/б плиты; крыша рулонная, с кирпичным тамбуром, двумя кирпичными сходами в подвал, железобетонным подвалом и асфальтобетонным покрытием. Земельный участок: площадью 0,0625 га, сроком аренды 99 лет, кадастровый номер 221850100001003220, для размещения объектов розничной торговли. Ограничение в использовании всего участка в связи с нахождением в водоохранной зоне реки, а также охранная зона линии электропередач напряжением до 1000 В на площади – 0,0026 га. | **68 135 224** | **6 813 522** |
| 3. | Капитальное строение с инвентарным номером 201/С-11373, расположенное по адресу: Витебская область, Городокский район, г. Городок, ул. Вокзальная, д. 53, и право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 201/С-11373 – здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг (здание фельдшерско-акушерского пункта) – одноэтажное бревенчатое здание 1949 г. постройки, общей площадью 105,4 кв. м, фундамент бутобетонный, перекрытия деревянные, крыша шиферная, с двумя холодными кирпичными пристройками, дощатым сараем, забором деревянным, двумя калитками, уборной. Земельный участок: площадью 0,1126 га, кадастровый номер 221850100001003221, срок аренды участка 99 лет, для размещения объектов здравоохранения и предоставления социальных услуг. Охранная зона линии электропередач напряжением до 1000 В на площади 0,0204 га. | **37 089 871** | **3 708 987** |

ОРГАНИЗАТОР: фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212)476096, сайты: www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail: fondvitebsk@tut.by.

ПРОДАВЕЦ: Транспортное республиканское унитарное предприятие «Витебское отделение Белорусской железной дороги», телефон в Витебске: (0212) 37 88 87.

**Условие пользования земельным участком:**

**Лот № 1:** заключение победителем аукциона с исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения исполнительного комитета о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок.

**Лоты №№ 2 и 3:** заключение победителями аукционов с райисполкомом договоров аренды земельных участков и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении им земельного участка государственной регистрации права на земельные участки; получение победителями аукционов в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на реконструкцию объектов в срок, не превышающий два года.

**1. Аукцион состоится 17 ноября 2009 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

Для участия в аукционе приглашаются: граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица, копия документа, подтверждающего государственную регистрацию, **без нотариального засвидетельствования;** индивидуальными предпринимателями – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, **без нотариального засвидетельствования;** иностранными юридическими лицами – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

2. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 16.11.2009 г. до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 17.11.2009 с 14.00 до 14.45.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

3. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

4. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона - участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

5. Организатор аукциона вправе отказаться от проведение аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

6. **Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения райисполкомом), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в сумме 2 миллиона рублей (по каждому лоту), расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; **не позднее 12 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.


**Яна і ён**

# У «ОРГАНАХ РУХУ» — НІЯКАГА РУХУ?

## або Не стамляйцеся «падкладваць дровы»!

**Сэксалагічнай службе Беларусі — 35 гадоў. Прыём пацыентаў па інтымных пытаннях пачаўся ў кастрычніку 1974 года. Сёння праз сэксалагічнае аддзяленне Мінскага гарадскога псіханеўралагічнага дыспансэра праходзіць да 7 тысяч чалавек у год. Гэта, безумоўна, больш, чым калісьці, аднак неверагодна мала з пункту гледжання распаўсюджанасці сэксуальных праблем, кажа загадчык сэксалагічнага аддзялення Алег ХІМКО. І дадае: пакуль тыя, каму сапраўды патрэбная падобная дапамога, ігнаруюць свае праблемы, на прыём пайшлі... крыху старэйшыя за 16.**

— Паводле сусветных звестак, кожны дзесяты мужчына пасля 21 года сутыкаецца з цяжкасцямі эрэктыльнай функцыі. А сэксалогія займаецца яшчэ шэрагам іншых інтымных праблем: зніжэннем сэксуальнага жадання, кароткачасовасцю палавога кантакту, адсутнасцю аргазму і г.д. Меркаваць жа аб тым, што беларускаму насельніцтву не ўласцівыя такія расстройствы, не выпадае. Узяць хоць бы ўскосныя доказы. Адзін з самых важных фактараў скасавання шлюбу — сэксуальная праблема ў аднаго з партнёраў. А статыстыку распаду нашых сем'яў мы ведаем... Акрамя таго, паводле звестак Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, на першым месцы ў ліку прычын бясплоднасці сярод мужчын знаходзіцца парушэнне сэксуальнай функцыі.

***— Словам, у розныя перыяды жыцця кожны чалавек мае патрэбу ў дапамозе сэксолага?***

— Так і ёсць, і гэта не гучныя словы. Сэксуальнасць чалавека залежыць ад вялікай колькасці фактараў. Уздзеянне стрэсаў, навакольнага асяроддзя, ад звычак, захворванняў, узросту... Так, з цягам часу ў мужчын назіраецца натуральнае зніжэнне сэксуальнай функцыі, паколькі ў іх мяняецца гарманальны фон, стан сасудаў. Адсюль і пэўныя праблемы з патэнцыяй, зніжэнне самой патрэбы ў палавых кантактах. У жанчын жаданне і магчымасці могуць захоўвацца на досыць высокім узроўні. Так і ўзнікае канфліктная сямейная сітуацыя. Больш за тое, акрамя фізіялагічных, псіхалагічных змен, якія адбываюцца з кожным чалавекам, змяненням падвяргаюцца і ўласна ўзаемаадносіны ў пары: праходзіць закаханасць, адбываецца пэўнае ахаладжэнне. Змяняюцца жыццёвыя абставіны — нараджаюцца новыя праблемы...

***— Мяркую, зніжэнне лібіда і патэнцыі — найбольш распаўсюджаныя мужчынскія праблемы. Наколькі магчыма дапамагчы дужаму полу ў іх вырашэнні?***

— Мужчына ў гэтым выпадку — ломкае звяно. Калі ўсё, што ў мужчыны размешчана звонку, не функцыянуе паўнацэнна, гэта абавязкова адбіваецца на якасці сэксу. З іншага боку, адукаваныя ў сэксуальным сэнсе партнёры, з шырокім дыяпазонам прымальнасці пяшчоты, могуць хутчэй вырашыць праблему.

***— Якія асноўныя сэкс-праблемы выпадаюць на лёс жанчын?***

— Найчасцей яны пакутуюць ад адсутнасці сэксуальнага жадання і аргазму, што можа быць абумоўлена як застарэлымі псіхалагічнымі праблемамі, так і зменай пэўных абставінаў жыцця, напрыклад, нараджэннем дзіцяці. На другім месцы — фрыгіднасць — спалучаная паталогія, пры якой назіраецца як зніжэнне жадання, так і адсутнасць аргастычнай разрадкі. А ў цэлым праблем у слабага полу таксама шмат. Дарэчы, у апошнія гады намецілася тэндэнцыя росту жаночых зваротаў да сэксолагаў. Дзесяць гадоў таму на кансультацыйным прыёме можна было сустрэць пяць мужчын і адну жанчыну. Цяпер — прыкладна пароўну адных і другіх.

***— Кансультацыя інтымнага кшталту хіба не мае на мэце работу з парай?***

— Часам мы просім уключыцца ў работу і партнёра. Але ўсё залежыць ад сітуацыі. Для аднаго з прадстаўнікоў інтымнага саюза праблема можа стаяць больш востра, а значыць, больш істотна пагаршаць якасць яго жыцця. Скажам, жаданне ў мужчыны знаходзіцца на досыць высокім узроўні, а функцыя пакутуе. У такім выпадку церпяць не толькі ўзаемаадносіны з жанчынай, але перш-наперш пакутуе сам мужчына. Лібіда — складаная рэч, неўтаймаваны звер, і калі яго не рэалізаваць так, як гэта належыць паводле прыроды, узнікаюць вельмі глыбокія псіхалагічныя траўмы. Апошнія ў сваю чаргу могуць справакаваць, напрыклад, дэпрэсіўныя, неўратычныя расстройствы...



***— Для некага і адзін дзень без сэксу — расстройства, а нехта скажа: ідзі ты са сваім сэксам — грошы давай... А што менавіта вызначае, наколькі важным для чалавека будзе сэксуальнае жыццё?***

— Калі вы патрабуеце назваць штосьці адно, то, напэўна, правільным будзе ўзгадаць фізіялагічную канцэнтрацыю тэстастэрону — гармону, які ёсць, як вядома, і ў мужчын, і ў жанчын, але ў першых гэта канцэнтрацыя ў дзясяткі разоў вышэйшая. Тэстастэрон — гэта гармон, які забяспечвае менавіта рэалізацыю сэксуальнага жадання.

***— І ў жанчын таксама?***

— Таксама. Не эстрадыёл, як лічылі раней, а менавіта тэстастэрон. Гармон эстрадыёл адказвае за эратычны складальнік жадання — імкненне да ласкі, абдымкаў, пацалункаў, а рэалізацыя сэксуальнай блізкасці ўскладзена на тэстастэрон... Гэта калі гаварыць вельмі сцісла і вельмі простай мовай, паколькі ў рэальнасці ўсё нашмат складаней.

***— Вы хочаце сказаць, што адным толькі «выраўноўваннем» узроўняў тэстастэрону ў пары праблему сэксуальных адносінаў не вырашыць?***

— Правільна. Таму што ёсць яшчэ псіхалагічны свет узаемаадносінаў. Вось чаму, як мы і гаварылі вышэй, часам неабходна працаваць з парай. Сэкс — функцыя парная, і пры яе парушэнні пакутуе сістэма, а не адзін чалавек.

***— З псіхалагічнага пункту гледжання ў большасці выпадкаў усё, напэўна, упіраецца ў спрадвечную дылему: мужчыну цягне да перамен, а жанчыну — да пастаянства?***

— Як ні дзіўна гэта прагучыць, але імкненне да перамен унутры пары, а яго, сапраўды, забяспечвае актыўны пачатак — мужчына — стварае спрыяльнае пастаянства таго пачуцця, якое калісьці ўзнікла і можа захоўвацца доўгі час. Па сутнасці, жанчына беражэ ачаг, хатні агонь, а мужчына падкладвае ў яго дровы. Гэта закон яднання гома- і гетэрапачаткаў.

***— І як толькі мужчына стамляецца падкладваць дровы, узнікае праблема?***

— О, прычын для ўзнікнення праблем можа быць вельмі шмат! І павінен заўважыць, што тэма вернасці і здрады — асобная.

***— А можна прычыны сэксуальных праблем раскласці па паліцах: скажам, на першым месцы — узровень гармонаў, на другім — псіхалагічны складальнік?..***

— У першую чаргу ў падмурку сэксалагічных праблем хаваюцца псіхагенныя і паводзінавыя расстройствы. Адсюль — сіндром трывожнага чакання няўдач, анаргазмія і імпатэнцыя, якія часта здараюцца на фоне дэпрэсіі ці неўрозу... А ўвогуле наўрад ці магчыма раскласці ўсё па паліцах. Паколькі давядзецца разбірацца не толькі ў тым, як і што адбываецца з канкрэтным чалавекам, але і ўлічыць парны ўплыў партнёраў адно на аднаго. Да таго ж, пад уздзеяннем сацыяльных і шэрагу іншых фактараў нашы стасункі пастаянна шліфуюцца. Тое, што было паміж партнёрамі, напрыклад, год таму, і тое, што ёсць цяпер — дзве вялікія розніцы. Чаму і як адбылася гэта перамена — вось на гэтыя пытанні і давядзецца разам шукаць адказ.

Любая з названых намі зараз прычын можа заняць у канкрэтнай пары першае месца. Дапусцім, жонка здрадзіла, узнік канфлікт. «Параненыя» бок даравае, але ў яго парушылася сэксуальная функцыя, прапала жаданне. Такім чынам, спачатку мела месца псіхалагічная праблема, а потым фізіялагічная. А можа быць і наадварот: мужчына захварэў на цукровы дыябет, у выніку чаго з'явілася зніжэнне эрэктыльнай функцыі, і ў жонкі ўзніклі пэўныя прэтэнзіі. Адмоўным чынам на эрэкцыю можа паўплываць і гіпертанія, калі страчваецца эластычнасць сасудаў, не надта якасна пачынаюць працаваць пянільныя артэрыі. Прыём розных прэпаратаў, гіпатэнзіўных у тым ліку, можа прыводзіць да сэксуальных парушэнняў. Акрамя таго ж тэстастэрону, яшчэ шэраг гармонаў уплывае на эрэктыльную функцыю. У сэксалогіі нават існуе паняцце эндакрыналагічнага аспекту, паколькі вядома, што захворванні шчытападобнай залозы, напрыклад, вузлавы валляк, мяняюць суадносіны як гармонаў самой шчытападобнай залозы, так і палавых гармонаў, што, безумоўна, адбіваецца на сэксуальным аспекце.

***— Значыць, вы накіроўваеце сваіх пацыентаў і да іншых спецыялістаў?***

— У крайніх выпадках накіроўваем. Хоць у цэлым сэксолаг сам валодае ведамі па ўралогіі, эндакрыналогіі, неўралогіі...

***— Ці часта вузкія спецыялісты адпраўляюць да вас сваіх пацыентаў — напрыклад, мужчын з сэксуальнымі расстройствамі, якія ўзніклі ў выніку пэўнага хранічнага захворвання?***

— Гэта было б пажадана. І ў апошнія гады ўзнікла тэндэнцыя пераймальнасці сярод урачоў. З іншага боку, хацелася б, каб большыя магчымасці былі ў межах нашага аддзялення. Зараз у ім працуюць яшчэ два ўрачы-сэксолагі, якія вядуць паўнацэнны прыём. Акрамя гэтага, на нашай базе працуе міжведамасная камісія па змене полу, у склад якой уваходзяць прадстаўнікі міністэрстваў унутраных спраў, юстыцыі, адукацыі... А калісьці, не так даўно, у Мінску функцыянаваў асобны сэксалагічны цэнтр, дзе працавалі ў тым ліку прафесары кафедраў гінекалогіі, эндакрыналогіі, псіхатэрапіі. Была яшчэ сацыяльна-педагагічная служба, якая займалася асветніцкай дзейнасцю, чыталіся лекцыі ў школах... Цяпер мы спрабуем адрадзіць тое, што было.

***— А што ўяўляе сабой сэксалагічная служба ў абласцях?***

— У кожнай — па адным спецыялісце. Толькі ў Гомельскай — два. Адпаведныя аддзяленні функцыянуюць на базе псіхіятрычных бальніц або дыспансэраў.

***— Не густа....***

— Безумоўна. З іншага боку, насельніцтва ўсё яшчэ мала пра нас ведае. Спадзяюся, свой унёсак зробіць наш сайт www.sexolog.by.

***— Бывае так, што людзі звяртаюцца да сэксолагаў, што называецца, не па профілі?***

— Раней сапраўды палова кліентаў была не «профільнай». Цяпер колькасць «нашых» пацыентаў вырасла працэнтаў да 80. Значыць, насельніцтва становіцца больш адукаваным, больш чытае і, трэба заўважыць, больш патрабуе ад спецыялістаў. Вось мы і імкнёмся адпавядаць... Безумоўна, хочацца важкіх зрухаў, напрыклад, лепшай дыягнастычнай базы. Мая асноўная мэта на сёння — набыць апарат для даплерaграфіі сасудаў палавога члена. Такія апараты ёсць у Мінску, у тым жа Дыягнастычным цэнтры, але ж нам гэта патрэбна ў першую чаргу, паколькі размова ідзе пра спецыфічнае даследаванне, якое патрабуе пэўных навыкаў яго правядзення, ведання, што і як глядзець, якім чынам апісаць і ўлічыць убачанае. Хацелася б, каб мы на месцы маглі даследаваць і ўзровень усіх палавых гармонаў.

***— Што вы можаце сказаць пра самастойныя спробы мужчын прымаць віягру і падобныя прэпараты?***

— Вы цудоўна разумееце, што і аспірын можа быць вельмі шкодным. На шчасце, у апошні час аптэкі адпускаюць віягру па рэцэпце. Пры бескантрольным ужыванні сапраўды ёсць пагроза нашкодзіць здароўю і нават загінуць, асабліва для тых, хто лечыць стэнакардыю і прымае нітраты. У спалучэнні з віяграй дзеянне нітратаў узмацняецца, а значыць, чалавек можа загінуць ад непадкантрольнай гіпатэнзіі.

***— Гэты прэпарат — лячэнне або часовая дапамога?***

— І адно, і другое. Усё залежыць ад таго, калі, каму і з якой мэтай прызначаецца. Непажадана ўжываць яго хворым з сардэчна-сасудзістымі захворваннямі, пацыентам з павышанай трывожнасцю, якія лёгка падпадаюць пад залежнасць, паколькі можна атрымаць псіхалагічную залежнасць ад прэпарата, страціць веру ў свае сілы. Віягру лепей спалучаць з псіхатэрапіяй.

***— Інтэрнэт-сэкс-шопы — карысная рэч, на ваш погляд?***

— Думаю, карысная. Для адзінокіх жанчын або жанчын, якія пакутуюць ад анаргазміі. Тая ж вібрастымуляцыя ў разумных межах можа «запусціць» сэксуальны кампанент жанчыны. Праўда, такая форма сэксуальнай разрадкі можа перарасці ў дурную звычку, паколькі тут фарміруецца не толькі псіхалагічная, але і рэцэптыўная, на ўзроўні адчуванняў, залежнасць. Жанчына прывыкае да хуткага аргазму з дапамогай вібратара, і дасягнуць разрадкі пры нармальным палавым акце становіцца цяжка.

***— Што можна сказаць пра стымулюючае ўздзеянне алкаголю?***

— Яно ёсць толькі пры ўжыванні алкагольных напояў у разумных межах. Тады апошнія выступаюць у нейкім сэнсе ў ролі афрадызіякаў. У першыя гадзіны невялікая доза сапраўды стымулюе выпрацоўку тэстастэрону, абуджае матывацыю — стымулюе не толькі на сэкс, але ў цэлым на «подзвігі»... Але дзеянне моцнаградусных напояў не аднабаковае. Шэраг людзей адчуваюць яго седатыўны, заспакаяльны эфект.

Калі ж ужыванне выходзіць за агульнапрынятыя нормы, пачынаецца стратнае ўздзеянне алкаголю на ўсе органы і сістэмы. Парушаецца ўспрыняцце свету, мяняюцца каштоўнасці, якасць узаемаадносінаў у пары, зніжаецца жаданне, пакутуе эрэктыльная функцыя. Пры хранічным злоўжыванні алкаголем прыгнятаецца гарманальны фон, зніжаецца ўзровень тэстастэрону, паколькі ён задзейнічаны ў працэсе ўтылізацыі, метабалізме алкаголю... Алкаголікі самі кажуць, што спачатку выпівалі і адчувалі неверагоднае жаданне авалодаць жанчынай, а потым неяк незаўважна стала ўсё адно. Таму што пры хранічным алкагалізме ўзнікаюць не толькі грубыя, але і дробныя, на клетачным узроўні, паломкі. Бывае, хтосьці кадзіруецца, перастае піць і думае, што ўсё само сабой наладзіцца. А яно не наладжваецца. Хворы лічыць, што гэткім чынам кадзіраванне падзейнічала, а насамрэч у арганізме адбыліся сур'ёзныя парушэнні.

***— Калі меркаваць па нараджальнасці сярод выпівох, то часам здаецца, што ў іх не так усё і дрэнна з сэксуальнай функцыяй...***

— Пітушчыя людзі не кантралююць нараджальнасць з-за зніжэння адказнасці за сябе і партнёра. Алкаголь жа абавязкова зніжае ўзровень тэстастэрону, уздзейнічае на іншыя гармоны, стрымлівае выспяванне сперматазоідаў і яйцаклеткі... Што датычыцца прымянення любых стымулятараў, то яны заўсёды маюць адваротны бок — здольнасць фарміраваць залежнасць. Калі ўзнікла праблема, неабходна не пазбягаць яе, а спрабаваць вырашыць разам з сэксолагам.

**Гутарыла Святлана БАРЫСЕНКА.**


**МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ сообщает о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность, который состоится 13 ноября 2009 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний**

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: г. Могилев, ул.Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 08.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – **9.11.2009 года** до 17.00.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Условия проведения аукциона – **наличие не менее двух участников.**

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон, желающие принять участие в аукционе представляют в сроки, указанные в извещении:

а) квитанцию о **внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 **(разовый платеж)**; б) документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя, а в случае участия в аукционе его представителя – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектами. Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения. Граждане, желающие участвовать в аукционе по нескольким лотам, вносят задаток в размере, установленном для земельного участка с наибольшей начальной ценой.

**Победители аукциона обязаны:** в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность внести плату за земельный участок (задаток засчитывается при внесении платы); возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. Ориентировочная (общая) сумма затрат (на победителей) составляет 10 миллионов рублей.

| №№ Лота | Адрес земельного участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | переулок 2-й Ровчакова, 1 | 0,0975 | 740100000001004772 | 17 666 000 | 1 590 000 |
| Лот № 2 | переулок 2-й Ровчакова, 2 | 0,0990 | 740100000001004774 | 17 937 000 | 1 614 000 |
| Лот № 3 | переулок 2-й Ровчакова, 3 | 0,0990 | 740100000001004775 | 17 937 000 | 1 614 000 |
| Лот № 4 | переулок 2-й Ровчакова, 4 | 0,0986 | 740100000001004776 | 17 865 000 | 1 608 000 |
| Лот № 5 | переулок 2-й Ровчакова, 5 | 0,0995 | 740100000001004777 | 18 028 000 | 1 623 000 |
| Лот № 6 | переулок 2-й Ровчакова, 7 | 0,0999 | 740100000001004779 | 18 100 000 | 1 629 000 |
| Лот № 7 | переулок 2-й Ровчакова, 10 | 0,1074 | 740100000001004781 | 19 459 000 | 1 751 000 |
| Лот № 8 | переулок 3-й Ровчакова, 4 | 0,0998 | 740100000001004783 | 18 082 000 | 1 627 000 |
| Лот № 9 | переулок 3-й Ровчакова, 6 | 0,0972 | 740100000001004784 | 17 611 000 | 1 585 000 |
| Лот № 10 | переулок 1-й Сараканайский, 1 | 0,1125 | 740100000001004762 | 20 383 000 | 1 834 000 |
| Лот № 11 | переулок 1-й Сараканайский, 7 | 0,0932 | 740100000001004765 | 16 886 000 | 1 520 000 |

Строений, сооружений и инженерных коммуникаций на земельных участках нет. В радиусе 500 м имеются сети водопровода и газопровода.

**Контактный телефон в г. Могилеве: 22 11 63.**

БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК
ТРАДИЦИИ НАДЕЖНОСТЬ КОМПЕТЕНТНОСТЬ

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2009 года

*ОАО «Белвнешэкономбанк» г. Минск, ул. Мясникова, 32*

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.10.2009 | на 01.10.2008 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 61933,4 | 54189,9 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 116991,8 | 94715,0 |
| 4 | Ценные бумаги | 1103 | 137480,3 | 10538,0 |
| | для торговли | 11031 | 0,0 | 0,0 |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | 0,0 | 0,0 |
| | в наличии для продажи | 11033 | 137480,3 | 10538,0 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 165447,1 | 314978,9 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 1201123,6 | 943981,7 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 5095,3 | 3399,9 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 77241,0 | 65540,3 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 18596,1 | 16697,8 |
| 10 | ИТОГО АКТИВЫ | 110 | 1783908,6 | 1504041,5 |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 818,0 | 6448,6 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 393284,5 | 325139,4 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 881227,4 | 726166,2 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | 5803,7 | 159,2 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 38244,0 | 23896,4 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 1319377,6 | 1081809,8 |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 327483,0 | 327483,0 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | 0,0 | 0,0 |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 20879,1 | 13173,0 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 61749,6 | 37970,5 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 54419,3 | 43605,2 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | 464531,0 | 422231,7 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 1783908,6 | 1504041,5 |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 552184,4 | 380347,4 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 441656,1 | 390424,8 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2009 года

*ОАО «Белвнешэкономбанк» г. Минск, ул. Мясникова, 32*

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.10.2009 | на 01.10.2008 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 140142,3 | 80042,9 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 71227,1 | 44627,4 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 68915,2 | 35415,5 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 47324,9 | 36811,0 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 5191,8 | 4934,4 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 42133,1 | 31876,6 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 20782,2 | 9586,7 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 29,4 | 100,6 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | 1181,7 | 49,4 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 12510,3 | 494,6 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 12779,6 | 7421,9 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 73562,3 | 54216,5 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 16985,5 | 9958,8 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 13054,3 | 6145,4 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 29708,8 | 13635,4 |

**Председатель Правления** **Г.А. Егоров**

**Главный бухгалтер** **З.С. Кушнерова**

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 6 от 27.10.2006. УНП 100010078.*



# ЯЕ ГЕРОІ — СЛУЦАКІ

Бываючы ў маіх калег, фотажурналістаў раённых газет, заўжды цікаўлюся: што новага трапіла ў іх аб'ектыў. Раённыя фотакарэспандэнты заўсёды самыя набліжаныя да штодзённага жыцця — таго жыцця, што атачаецца прыродаю, вясковым каларытам, эмоцыямі, выказанымі простым словам.

Але ж самае простае і самае выразнае слова не здольныя перадаць усяго зараду інфармацыі, які нясе ў сабе фотаздымак. Відаць, гэта з-за таго, што адзін з нас пачне разглядаць на фота твар героя, другі зацікавіцца навакольным пейзажам, трэці будзе вывучаць вышыванкі на адзенні...

Усё гэта разам і ёсць «штрыхі», якімі мастак малюе рэчаіснасць.

Адчуванне рэчаіснасці — абавязковы крытэрый для фотакарэспандэнта. Калісьці мы спасцігалі гэтыя аксіёмы на журфаку. У нашым студэнцкім гурце вылучалася хуткая, вострая на слова мінчанка Ларыса. Ведаю, што потым яе лёс быў звязны з мастацтвазнаўствам, з жывапісам, з працай над аўтарытэтнымі артыкуламі, рэцэнзіямі... Усё гэта было раней, а сёння, гартаючы слуцкую раёнку, я з цікавасцю затрымаў позірк на фотаздымках, падпісаных маёй былой аднакурсніцай Ларысай Салодкінай — сённяшняй супрацоўніцай раёнкі.

Можна мець шмат прафесій, можна заставацца знаўцам у розных справах, але здольнасць бачыць рэчаіснасць заўжды аб'ядноўвае ўсё гэтае ў адно: творчасць майстра становіцца зразумелай кожнаму.

Паглядзіце на здымкі зробленыя Ларысай Салодкінай — і вы пачуеце, пра што спяваюць мясцовыя артысты з вёскі Вясея. Паганяе вазок кіраўнік гурта Галіна Сак. Дарэчы, конь, як паведамляе аўтар фотаздымка, даўно служыць артыстам (так бы мовіць, неафіцыйны ўдзельнік гурта). На другім фотаздымку сям'я са Слуцка. Мікалай і Аксана Башуры, нягледзячы на свой даволі малады ўзрост, шматдзетныя бацькі. Шкада, на здымку не змясціўся «Ордэн Маці» — ім узнагароджана Аксана.



Зрэшты, калі мы кажам «герой фотаздымка», то сутнасць не ва ўзнагародах. Галоўнае, каб чалавек, з якім рэпарцёр знаёміць сваіх чытачоў, атрымаўся на фота блізкім і зразумелым, нібы наша ўласнае адлюстраванне ў нашым жа багатым на падзеі жыцці.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.35 | 18.15 | 10.40 |
| Віцебск — | 7.27 | 18.02 | 10.35 |
| Магілёў — | 7.25 | 18.05 | 10.40 |
| Гомель — | 7.19 | 18.04 | 10.45 |
| Гродна — | 7.50 | 18.31 | 10.41 |
| Брэст — | 7.48 | 18.34 | 10.46 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 11 кастрычніка. Месяц у сузор'і Дзевы.*

**Імяніны**

*Пр. ПАКРОВЫ (Пакроў Маці Божай), Георгія, Міхаіла, Рамана.*

*К. Маргарыты, Бярнарда.*



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.




Белгазпромбанк

Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк» — уполномоченный банк ОАО «Газпром» в Республике Беларусь

**Победитель республиканского конкурса «Лучший предприниматель»**

220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2, тел. 229 16 16 (администратор)
www.belgazprombank.by

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2009 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2009 г. | 2008 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 | 57 840,3 | 35 797,7 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 2 | 56 516,7 | 58 481,7 |
| 4 | Ценные бумаги | 1103 | | 190 202,7 | 214 875,0 |
| | для торговли | 11031 | 3 | 7 379,3 | 67 699,9 |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | 3.1 | – | – |
| | в наличии для продажи | 11033 | 3.2 | 182 823,4 | 147 175,1 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 4 | 364 673,2 | 56 073,3 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 5 | 1 246 672,1 | 1 049 463,0 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 6 | 45,9 | 58,9 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 7 | 55 278,9 | 30 435,3 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 8 | 20 842,0 | 17 933,5 |
| **10** | **Итого активы** | **110** | | **1 992 071,8** | **1 463 118,4** |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 9 | 16 136,1 | 21 108,3 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 10 | 494 867,4 | 554 257,6 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 11 | 877 299,8 | 570 139,0 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | | 51 767,7 | 14 799,2 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 12 | 240 794,8 | 29 396,2 |
| 17 | Всего обязательства | 120 | | 1 680 865,8 | 1 189 700,3 |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 13 | 218 593,8 | 218 593,8 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | | – | – |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | | 19 623,4 | 9 952,9 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 14 | 62 594,0 | 38 563,5 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 15 | 10 394,8 | 6 307,9 |
| 24 | Всего капитал | 121 | | 311 206,0 | 273 418,1 |
| **25** | **Итого обязательства и капитал** | **12** | | **1 992 071,8** | **1 463 118,4** |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 16 | **1 740 122,5** | **1 337 617,5** |
| 28 | Обязательства | 1302 | 17 | **637 654,4** | **660 116,4** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2009 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2009 г. | 2008 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 166 857,7 | 100 220,2 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 96 037,6 | 51 728,1 |
| 3 | *Чистые процентные доходы* | 201 | 18 | 70 820,1 | 48 492,1 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 40 267,6 | 29 600,1 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 11 295,0 | 10 820,6 |
| 6 | *Чистые комиссионные доходы* | 202 | 19 | 28 972,6 | 18 779,5 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 20 | 14 680,0 | 16 161,1 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 21 | 3 769,0 | -4 243,5 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | | 213,7 | 197,6 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 22 | 15 125,6 | -4 687,6 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 23 | 27 667,7 | 3 453,6 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 24 | 61 923,1 | 46 325,8 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 25 | 17 582,0 | 4 801,1 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | | 8 972,4 | 8 241,2 |
| **15** | **Прибыль (убыток)** | **2** | | **42 520,0** | **28 159,9** |

**Председатель Правления** **В.Д. Бабарико**

**Главный бухгалтер** **Т.М. Пивовар**

**Дата подписания 08 октября 2009 г.**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 8 от 27.10.2006 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100429079.*

## БЕЛАРУСКІЯ КУЛІНАРЫ ВЫСТУПІЛІ ГОДНА

**Пад эгідай Сусветнай асацыяцыі кулінарных саюзаў прайшоў І Бакінскі міжнародны гастранамічны Фестываль, у якім брала ўдзел і нацыянальная каманда кулінараў з Беларусі.**

По выніках конкурсу ў камандных спаборніцтвах удзельнікі з нашай краіны заваявалі адзін залаты і два сярэбраныя медалі, у індывідуальных спаборніцтвах — два залатыя, тры сярэбраныя і два бронзавыя медалі. Нацыянальнай камандзе кулінараў Беларусі таксама быў уручаны Кубак за захаванне нацыянальных традыцый у кулінарыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Крымінал

## Ягады ў памежнай паласе...

**На працягу двух дзён работнікамі Мікашэвіцкай міжрайінспекцыі пры правядзенні прыродаахоўнага рэйду на тэрыторыі Палескага лясгаса было канфіскавана 910 кілаграмаў безгаспадарчых журавін.**

Вызначыць асобы зборшчыкаў ягад не атрымалася, таму яны былі перададзены ў філіял Лунінецкага раённага спажывецкага таварыства.

Работнікі Тураўскай міжрайінспекцыі сумесна з вайскоўцамі-памежнікамі на тэрыторыі Мікашэвіцкага лясгаса ў памежнай паласе знайшлі і канфіскавалі журавіны ў колькасці 380 кілаграмаў, якую кінулі грамадзяне Украіны, што збеглі на сумежную тэрыторыю. Ягады здадзены ў Жыткавіцкае раённае спажывецкае таварыства.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Дарагую **Антаніну Мікалаеўну ВАРАНЬКО** віншуем у гэты цудоўны дзень **з прыгожым юбілеем**!

Няхай кожная раніца будзе светлай і сонечнай, дом не пакідаюць лад і прыемныя навіны, у сэрцы жывуць вера, надзея, любоў, а ў душы — вясна і цеплыня. Жадаем моцнага здароўя, поспехаў ва ўсіх справах, узаемаразумення, дабрабыту, багатага стала на гэты і ўсе наступныя юбілейныя даты!

**З любоўю — муж, дзеці, зяці, нявестка і ўнучак.**

## 14 кастрычніка

**Дзве даты**



**1842 год** — нарадзіўся Эдвард Вайніловіч, гаспадарчы і палітычны дзеяч Беларусі. Скончыў Пецярбургскі тэхналагічны інстытут. Узначальваў Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі. У 1906 годзе быў абраны членам Дзяржаўнай рады Расійскай імперыі. З 1911-га — дэпутат Мінскай губернскай земскай управы. У 1918 годзе выступіў з планам адраджэння ВКЛ. Быў прыхільнікам незалежнай Беларусі, выступаў супраць падзелу Беларусі ў 1920 годзе паводле Рыжскага дагавора. У памяць сваіх дзяцей у 1910 годзе пабудаваў Мінскі касцёл Сімяона і Алены.

**1964 год** — пленум ЦК КПСС вызваліў ад займаемай пасады першага сакратара ЦК Мікіту Хрушчова і абраў новым партыйным кіраўніком Леаніда Брэжнева.

**Цытата дня:**

***«Можна перанесці любую рану, акрамя раны сардэчнай, і ўсялякую злосць, толькі не злосць жаночую».***

**Біблейскія афарызмы. Сірах.**

## АДМОЎНЫ ЎПЛЫЎ ПОЎНІ

Свет і сусвет чалавека

**Поўню лічылі небяспечным часам, таму нашы продкі раілі перачакаць гэтыя некалькі дзён, устрымацца ад падарожжаў, не пачынаць ніякіх доўгатэрміновых спраў.**

- Поўня максімальна «напаўняла» жывыя арганізмы вадкасцю. Таму ў гэты час не нарыхтоўвалі дровы або «будаўнічы матэрыял» для новай хаты — усё згніе або драўніну паточаць чэрві.
- У поўню не абразалі і не прышчэплівалі дрэвы, каб яны не гублялі свой жываносны сок.
- Па той жа прычыне ў гэты час чалавеку лепш устрымацца ад «планавых» аперацый ці выдалення зубоў.
- Цікава, але добрая гаспадыня заўважала, што ў поўню трэба ліць менш малака, калі хочаш нешта на ім згатаваць, класці менш мукі для звычайнай выпечкі хлеба, «інакш будзе пераліваецца цераз край».
- Забаранялася ў гэтыя дні што-небудзь выносіць з хаты, пазычаць ці аддаваць, каб не вынесці з хаты «сваю поўню», г.зн. шчасце, дабрабыт і г.д.
- Лічылася, што калі закаханыя хлопец і дзяўчына «пяройдуць» месяцовую дарожку, якая бывае толькі ў поўню, яны ніколі не будуць разам.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

БЕЛАРУСБАНК

## ОФИЦИАЛЬНАЯ ТАБЛИЦА

**«Семьдесят второго тиража выигрышей по выигрышным вкладам в белорусских рублях», состоявшегося 09 октября 2009 года в г. Минске**

Выигрыши выпали на следующие номера счетов по выигрышным вкладам во всех учреждениях ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»:

| Номера счетов | Размер выигрыша в процентах к средней сумме остатка вклада | Номера счетов | Размер выигрыша в процентах к средней сумме остатка вклада |
|---|---|---|---|
| А022 | 112 (Сто двенадцать) | А546 | 900 (Девятьсот) |
| А068 | 112(Сто двенадцать) | А589 | 112(Сто двенадцать) |
| А092 | 112(Сто двенадцать) | А616 | 225 (Двести двадцать пять) |
| А150 | 112(Сто двенадцать) | А653 | 112(Сто двенадцать) |
| А191 | 112(Сто двенадцать) | А715 | 112(Сто двенадцать) |
| А207 | 112(Сто двенадцать) | А720 | 112(Сто двенадцать) |
| А265 | 112(Сто двенадцать) | А781 | 112(Сто двенадцать) |
| А308 | 450(Четыреста пятьдесят) | А830 | 450 (Четыреста пятьдесят) |
| А345 | 112(Сто двенадцать) | А862 | 112(Сто двенадцать) |
| А391 | 112(Сто двенадцать) | А889 | 112(Сто двенадцать) |
| А422 | 112(Сто двенадцать) | А936 | 112(Сто двенадцать) |
| А442 | 225(Двести двадцать пять) | А978 | 112(Сто двенадцать) |
| А504 | 112(Сто двенадцать) | – | |

В учреждениях ОАО «АСБ Беларусбанк», где число счетов более одной тысячи, во всех последующих тысячах выиграли те же номера, что и в первой тысяче, т.е. за №№ А022, А1022, А2022 и т.д.

**Председатель комиссии:**
**Владимир Максимович Рудько**
первый заместитель главы Администрации Заводского района г. Минска

**Ответственный секретарь:**
**Татьяна Александровна Ясинская**
заместитель директора департамента розничного бизнеса ОАО «АСБ Беларусбанк»

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912

## Усміхнемся!

**— А мой коцік не хоча есці тое, што я яму гатую...**
**— На нос намаж.**
**— Мужу?!**

☺

Рэжысёр акцёру пасля прэм'еры:

— Мала таго, што ты прыйшоў у тэатр п'яны, мала таго, што забыўся палову ролі, дык ты яшчэ і старую-працэнтшчыцу не засек, а задушыў!

Акцёр:

— Дык цяжка перайначыцца, усё жыццё іграў Атэла...

☺

**І не расказвайце мне пра суседскі дрыль у суботу раніцай. Я жыву над загсам...**

☺

— Якая розніца для паляўнічага паміж сабакам і лісіцай?

— Прыкладна дзве шклянкі гарэлкі.

☺

**Толькі ў Маскве жывуць вельмі добрыя і спагадлівыя людзі. Напрыклад, аднаму звычайнаму чалавеку ў вагоне метро дастаецца адно месца, а бамжу ажно тры!**




ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 5627. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12